ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -вдатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63. 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 23 лютага 1930 г.
№ 45 (3553)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Чырвоная армія, стойкі вартаўнік, які ахоўвае Рэспубліку Саветаў--бацькаўшчыну пралетарыяту ўсяго сьвету

Да ўсіх рабочых і чырвонаармейцаў, да ўсіх працоўных БССР

ВОДЗВА Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) Беларусі

Капіталістычны сьвет заблытаўся ў клясавых непрымірымых супярэчнасьцях.

З кожным днём павялічваецца і абвастраецца барацьба паміж асобнымі буржуазнымі дзяржавамі за рынкі сыравіны, збыту і экспарту капіталаў.

Ва ўвесь рост імпэрыялістычныя драпежнікі ставяць пытаньне аб новым перадзеле сьвету шляхам новай імпэрыялістычнай бойкі, да якой ліхаманкава рыхтуецца ўвесь капіталістычны сьвет.

Уся сучасная навука і тэхніка пастаўлены ў капіталістычных краёх на службу вайсковай справе. Вайсковыя бюджэты растуць і кладуцца вялікім цяжарам на плечы рабочае клясы. Будуюцца новыя морскія браніраваныя суды, удасканальваюцца танкі, вынаходзяцца сьмяротныя газы, праводзяцца і пашыраюцца розныя вайсковыя работы, мэта якіх—забясьпечыць жорсткую вайсковую дыктатуру капіталу на выпадак вайны.

Каты рабочае клясы, верныя памочнікі фабрыкантаў і абшарнікаў—сацыял-фашыстыя—адкрыта дапамагаюць капіталістым усяго сьвету падрыхтаваць новы ўзброены напад на Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Небясьпека імпэрыялістычнага нападу на Савецкі Саюз абвастраецца ростам рэвалюцыйных настрояў рабочае клясы на Захадзе і посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Сусьветны капіталізм, адчуваючы набліжэньне свае сьмяротнае гадзіны праз ажыцьцяўленьне Савецкім Саюзам пяцігодкі і посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва—узмацняе падрыхтоўку нападу на Савецкі Саюз, прабуючы справакаваць інтэрвэнцыю.

Гэтым агідным мэтам служыць і тая шалёная, нарастаючая і брыдкая сваёю гнюснасьцю, хлусьня і цкаваньне Савецкага Саюзу, якія вядуцца буржуазіяй і іх прыхвасьнямі, пачынаючы рымскім папаю і канчаючы прадажнымі сацыял-фашыстымі.

Вось чаму мы да 12-й гадавіны Чырвонае армеі зноў прымушаны заявіць, што сучасныя міжнародныя ўзаемаадносіны настойліва патрабуюць ад рабочае клясы, ад усіх працоўных нашага краю асабліва ўвагі да пытаньняў падрыхтоўкі Савецкага Саюзу да абароны, да пытаньня далейшага ўзмацненьня ўзброеных сіл першага ў сьвеце краю Саветаў.

На базе вялізарнейшага росту сацыялістычнай індустрыі, у першую чаргу цяжкай прамысловасьці, якая вытварае сродкі вытворчасьці, на базе набываючага вялізарны размах калгаснага руху беднаты і сераднятства, бальшавіцкі тэмп якога дае ўпэўненасьць, што на працягу двух год Савецкая Беларусь стане рэспублікай суцэльнае калектывізацыі,—яшчэ з большай выразнасьцю вызначаецца доля і значэньне Чырвонае армеі, як вернага вартавога нашага краю будуючагася сацыялізму.

Суцэльная калектывізацыя ня толькі раёнаў і округ, але цэлых абласьцей—зьяўляецца адбыўшымся фактам. Мы стварылі ўмовы для замены дробнай таварнай сялянскай вытворчасьці—буйной аграмаджанай гаспадаркай і паставілі пытаньне аб ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Гэту новую палітыку Камуністычнае партыі рабочая кляса можа праводзіць дзякуючы таму, што верны вартаўнік заваёў Кастрычніка—наша магутная, сталёва зьнітаваная Рабоча-Сялянская Чырвоная армія пільна сочыць за ворагам.

Чырвоная армія, якая вартуе межы Савецкага Саюзу, неаднакраць даводзіла ворагам Рэспублікі Саветаў сваю моц і падрыхтаванасьць да абароны СССР.

Апошнія падзеі на Далёкім Усходзе зьявіліся яшчэ адным з яскравых довадаў вытрыманасьці і баяздольнасьці аднаго з атрадаў нашай слаўнай Чырвонай армеі—АДУА.

Моц нашае Чырвонае армеі зьяўляецца довадам таго, што толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту можа існаваць армія, якая злучае ваенную справу з непасрэдным удзелам у справе сацыялістычнага будаўніцтва. З радоў Чырвонае армеі чэрпаюцца сёньня дзесяткі тысяч масавікоў-барацьбітоў за справу ажыцьцяўленьня задач Камуністычнае партыі і Савецкае ўлады па калектывізацыі вёскі, яе сацыялістычнай рэканструкцыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

12-я гадавіна Рабоча-Сялянскай Чырвонай армеі зьявіцца аглядам баяздольнасьці ня толькі Чырвонае армеі, але і баяздольнасьці ўсяго Савецкага краю.

Перад тварам ваеннае падрыхтоўкі імпэрыялістых мы яшчэ і яшчэ раз заявім у гэты дзень: **МЫ ХОЧАМ МІРУ; РАБОЧАЯ КЛЯСА, ЯКОЮ КІРУЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ, ЗРОБІЦЬ УСЁ, КАБ ПАПЯРЭДЗІЦЬ ПАЖАР ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЕ ВАЙНЫ, АЛЕ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫХ ДРАПЕЖНІКАЎ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ БУДУЦЬ ЗАЎСЁДЫ УЗМАЦНЯЦЬ СВАЮ ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ, КАБ У ЧАСЕ ВАЕННАЕ НЕБЯСЬПЕКІ АДСТАЯЦЬ ЗАВАЁВЫ КАСТРЫЧНІКА АД НАПАДУ КЛЯСАВЫХ ВОРАГАЎ.**

Загартаваная ў бойках грамадзянскае вайны, на чале працоўных мас сялянства, пры падтрыманьні міравога пралетарыяту, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі рабочая кляса СССР здолее даць рашучы адпор імпэрыялістычным драпежнікам.

Пралетары БССР! Няўхільна выконваючы пяцігадовы плян гаспадарчага будаўніцтва, узмацняйце абарону СССР!

Няхай жыве Чырвоная армія—узброены атрад сусьветнае рэвалюцыі!

Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная Партыя (бальшавікоў)—кіраўнік і арганізатар Чырвонае армеі.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ.

Загад войскам Беларускай вайсковай акругі № 40

21 лютага 1930 году, гор. Смаленск

12-я гадавіна Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі праходзіць у абстаноўцы грандыёзных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Магутны рост індустрыялізацыі краю і калетывізацыя сельскае гаспадаркі далі магчымасьць Камуністычнай партыі і Савецкай уладзе прыступіць да вырашэньня задачы замены кулацкае вытворчасьці буйною вытворчасьцю саўгасаў і калгасаў, перайсьці ад палітыкі абмежаваньня ёксплёататарскіх імкненьняў кулака да новае палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Гэтыя посьпехі робяць наш Савецкі Саюз усё больш непахісным цытаделяю міравога пралетарыяту.

Ва ўсіх капіталістычных краёх пачаўся жорсткі гаспадарчы крызіс. Мільёны беспрацоўных не знаходзяць сабе кавалка хлеба. Руйнуюцца сяляне, выміраюць ад голаду калёніяльныя рабы і працоўныя ўсяго сьвету з усё большай надзеяй глядзяць на нашу краіну, як на сапраўдную бацькаўшчыну ўсіх прыгнечаных і эксплёатаемых, дзе пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі бур на расьце сацыялістычная гаспадарка і рашуча выкарчоўваюцца апошнія карэньні капіталізму.

Вось чаму з такой шалёнай злосьцю кідаецца зараз на СССР уся імпэрыялістычная зграя, сьпяшаючы на дапамогу сваім верным служкам і саюзьнікам—кулаку, нэпману, шкоднику.

Набывалае разбешчанае цкаваньне супроць СССР вядзецца ў капіталістычных краёх. Ліхаманкава ствараюцца вайсковыя саюзы на заходняй мяжы СССР. Нячувана растуць узброеньні. Імпэрыялістыя Англіі, Францыі, Нямеччыны не затрымліваюцца перад самымі страшэннымі правакацыямі краю Савецтаў. Прадажная банда сацыял-фашыстых розных колераў успушлівае выконвае загады сваіх гаспадароў, прабуючы здурманіць і ўнесьці разлажэньне ў рады рабочых. З розных бакоў падрыхтоўваецца плян вайсковага нападу на СССР. Шырока разгарнулася дзейнасьць па стварэньні адзінага капіталістычнага фронту супроць краю будуючагася сацыялізму.

Перад часьцямі акругі таксама, як і перад усёй Чырвонай арміяй, стаіць адказная задача—быць заўсёды на варце, усімі мерамі ўзмацняць сваю баявую гатоўнасьць і абароназдольнасьць СССР.

Часьцям БВА першым прыдзецца прыняць на сябе ўдар ворага, удар, які рыхтуецца з боку нашых капіталістычных суседзяй, якія абарачаюцца ў вайсковы лягер.

Гэта ўскладае на часьці акругі вялізарнейшую адказнасьць, патрабуе ад іх кіпучае энэргіі, энтузіязму і напружаных намаганьняў для павышэньня сваёй баявой вызучкі, гатоўнасьці і ўменьня ў любы момант і ў любой абстаноўцы з посьпехам выканаць баявыя задачы.

Згуртаванасьць і высокая актыўнасьць начскладу і чырвонаармейцаў, посьпехі, якіх яны дабіліся да 12-й гадавіны, шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва, тысячы ўдарнікоў, якія пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі вядуць усю аэтэтную масу да новых посьпехаў—зьяўляюцца заручаю далейшага магутнага ўздыму баявой моцы Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Актыўна ўдзельнічаючы ў сацыялістычным будаўніцтве, выкарыстоўваючы ўсе маючыяся магчымасьці для выканьня баявых заданьняў Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР па падрыхтоўцы капгасных кадраў, па ўцягненьні 100 проц. сялян-чырвонаармейцаў у калектыўныя гаспадаркі і тым спрыяючы рэалізацыі палітыкі партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы, ні адзін чырвонаармеец, камандзір і палітработнік, аднак, ні на адну хвіліну не павінны забываць пра сваю галоўнейшую задачу—быць дасканала падрыхтаванымі байцом да надыходзячай узброенай барацьбы з міжнародным капіталам.

Узрастаючая моц сацыялістычнае індустрыі забясьпечвае магчымасьць узбраеньня Чырвонай арміі новай магутнай тэхнікай.

Даеш танк, самалёт! Даеш матор! Даеш магутную тэхніку Чырвонай арміі!

Камандзіры, палітработнікі і чырвона армейцы! Аўладайце на справе тэхнічнымі сродкамі барацьбы! Аўладайце вышэйшымі формамі зучсанача бою для абароны Савецкага Саюзу!

З нябывалым уздымам адгукнуліся байцы акругі на заклік РВС БВА даць да 12-й гадавіны РСЧА дзесяць тысяч новых ударнікоў. У кароткі тэрмін яны—перавыканалі гэта заданьне.

Нашае палкое прывітаньне ўдзочіхам Чырвонае арміі!

Пад знакам вялічайшае пільнасьці і поўнае баявой гатоўнасьці правядзем 12-ю гадавіну РСЧА!

Няхай жыве СССР—край будуючагася сацыялізму!

Няхай жыве УсесКП(б)—правадыр і кіраўнік працоўных у іх барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва, правадыр і арганізатар перамог Чырвонай арміі!

Чырвонаштандарная Далёка-Усходняй арміі, не байцом, камандзірам, палітработнікам—наша брацкае прывітаньне!

Слава гэорям Далёка-Усходняй, якія палі ў баёх за сацыялізм!

Няхай жывуць байцы, гэрэі, кіраўнікі 1-й Коннай арміі, якія пакрылі сябе неўзрадальнаю славай у баёх за пралетарскую рэвалюцыю!

Загад прачытаць ва ўсіх ротах, батарэях, эскадронах і камандах.

Камандуючы войскамі БВА ЯГОРАЎ.
Члены РВС АРАНШТАМ і РУМЯНЦАЎ.

Загад Рэвваенсавету СССР

22 лютага, 1930 г. Масква

17-га лістапада 1929 году мінула 10 год са дня арганізацыі 1-ай Коннай арміі. Гэты слаўны гістарычны юбілей Рабоча-Сялянская Чырвоная армія сьвяткуе разам з мільёнамі працоўных 23-га лютага.

Палкі старэйшых дывізій 1-й Коннай арміі склаліся летам і восенью 1918 года з асобных атрадаў чырвоных партызан, рэвалюцыйных сялян, батракоў і бяднейшага казацтва Сальскай акругі, Дону, Стаўропаля, донбасаўскіх і сталінградзкіх рабочых.

З першых-жа дзён стварэньня на поўдні савецкай улады клясавая барацьба ў гэтых абласьцёх прыняла асабліва жорсткі характар. Яшчэ зімой 1918 году ўсе станіцы, хутары, мястэчкі і пасёлкі Паўночнага Каўказу рэзка падзяліліся на два непрымірымыя варожыя лягеры. На адзін бок стала багатае казацтва, якое правільна бачыла ў пралетарскай рэвалюцыі канец свайго раскошнага эксплёататарскага жыцьця. Па другі бок сталі батракі, казацкая і сялянская беднота і «іпагароднія» сераднякі, якія правільна бачылі ў пралетарскай рэвалюцыі сваё вызваленьне. Закіпела жорсткая барацьба, якая ішла побач з нячуванымі коерсткасьцямі.

Вось чаму асабовы склад чырвоных конных атрадаў стаў арганізуючым і моцным рэвалюцыйным ядром для фармаваньня палкоў чырвонай коньніцы.

У выключных па ўпартасьці баёх з белагвардзейскімі арміямі ў пачатку 1919 году пад Царыцынам, на Сале, Маныч ўзмацнелі і вырасьлі ў гэтых часках чырвонаштандартныя 4-я і 6-я кавалерыйскія дывізіі.

Створаны з іх 26-га чэрвеня 1919 году 1-шы Конны корпус 10-й Чырвонай арміі на працягу 2 з палав. месяцаў правёў дасканалую апэрацыю па зьнішчэньню першых партызанскіх атрадаў—Сальскай і Стаўропальскай акругах—4 машына-трактарныя станцыі, якім надана імя 1-й Коннай арміі. Рэвваенсавет выказвае ўпэўненасьць, што байцы 1-й Коннай арміі дзе-б яны ні знаходзіліся, будуць заўсёды ў першых радох па сацыялістычнай перабудове вёскі і зоймуць першае месца ў барацьбе з вясковай буржуазіяй і кулакамі за калектывізацыю і новыя формы сельскае гаспадаркі.

У адзнаку вялізарных заслуг Коннай арміі ў бойках грамадзянскай вайны ЦВК СССР, паводле хадайніцтва Рэвваенсавету, узнагарадзіў 8-ю і 10-ю кавдывізіі ордэнам Чырвонага Сьцягу, зраўняўшы іх з старэйшымі чырвонаштандартнымі 4-й і 6-й кавдывізіямі.

Баявая практыка Коннай арміі навучае нас, што ва ўмовах мэханізаванай вайны, якая носіць клясавы характар дзеяньне конных мас набывае вялізарнае значэньне. Але гэтае значэньне ў сучасных умовах вайны залежыць і ад таго, у якой ступені тэхнічнае забесьпячэньне войск гарантуе выкананьне ўскладзеных на іх задач. Для таго, каб у будучай вайне быць здольнай паўтарыць баявую работу Коннай арміі чырвоная коньніца павінна асвоіць і дастасаваць да баявых дзеяньняў сучасныя тэхнічныя сродкі барацьбы. Рэвваенсавет упэўнены, што ўсе старыя байцы, камандзіры і палітработнікі Коннай арміі ў выпадку ваеннай пагрозы зноў стануць пад Чырвоны сьцяг, сальлюцца ў адну магутную баявую сям'ю і зьмятуць усіх хто адважыцца стаць на дарозе ўсёй раможнай пралетарскай рэвалюцыі.

Вечная памяць загінуўшым байцом.

Слава байцом, камандзірам і палітработнікам баявых кавалерыйскіх чырвонаштандарных дывізій 1-й Коннай арміі!

Няхай жыве Чырвоная армія!

Наркамваенмор і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.

ЯН ГАМАРНІК

За аўладаньне тэхнічнымі сродкамі барацьбы

Сёньня Чырвонай арміі мінула 12 год і 10 год прайшло з часу стварэньня аднаго з слаўнейшых яе атрадаў—Першай коннай арміі.

Сёньня ў часьцях Чырвонай арміі, на фабрыках, заводах, калгасах і саўгасах старыя байцы грамадзянскай вайны будуць дзяліцца сваімі ўспамінамі аб слаўных, гэраічных баёх за справу сацыялізму, у баёх супроць Дзянікіна, Урангеля, Пятлюры, Юдзеніча, Калчака і белапалякаў. Перад слухачом разгорнецца жывы малюнак баявых гераічных учынкаў Чырвонай арміі, ліхіх рэйдаў першай коннай арміі. Але сёньня гутарка будзе ня толькі аб даўно мінулых баёх, а аб баёх нядаўніх, апошняга году, на Далёкім Усходзе. Сёньня ўжо і чырвонаармеец АДУА раскажа аб тым, як ён абараняў пралетарскую рэвалюцыю на далёкай савецка-кітайскай мяжы.

У агульным выніку 12 год барацьбы і будаўніцтва Чырвонай арміі, мінулы 12-ты год, год не ардынарны, год адмежны,—у гэты год імпэрыялістыя прабавалі памацаць нас штыком і атрымалі руйнуючы адпор. У гэтым годзе наш край дабіўся вялікага пералому, вялізарных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве і ў адпаведнасьці з гэтым, на базе гэтага, расла і мацнела Чырвоная армія. 12-ты год, па волі ворагаў нашых, стаў годам баявой праверкі Чырвонай арміі.

Праверка паказала дасканалую баяздольнасьць, высокі палітыка-маральны стан часьцей, поўную адданасьць байцоў справе пралетарскай рэвалюцыі і ўменьне змагацца за яе.

12-ты год прайшоў пад знакам значнага колькаснага і якаснага росту партарганізацыі і камсамолу ў арміі, рашучай барацьбы іх за генэральную лінію партыі, супроць усякага апартунізму, пад знакам зьнішчэньня «беларуска-талмачоўскіх» настрояў, пад знакам поўнага падтрыманьня ўсёй чырвонаармейскай масай палітыкі нашай партыі, пад знакам далейшага ўмацаваньня адзінства і зьнітаваньня ўсяго начскладу і самай цеснай сувязі яго з чырвонаармейцам.

Такія вынікі. 13-ты год армейскай работы мы пачынаем у абстаноўцы, калі фашыстыя, сацыял-фашыстыя, расійскія белаэмігранты, афэрыстыя, шпіёны, фальшываманэтчыкі, рымскі папа, Дэтэрдынг, Мілюкоў, Керанскі і іншая зграя злосна выюць аб крыжовым паходзе супроць Савецкага Саюзу, аб «маральнай» інтэрвэнцыі ў абарону кулака, якога мы ліквідуем, кулака-іх саюзьніка і апоры. «Супроць пяцігодкі, сарваць пяцігодку»—напісана на сьцягу сусьветнай контррэвалюцыі. «За пяцігодку»—напісана на сьцягах рэвалюцыйных пралетараў усяго сьвету.

Абвастраецца клясавая барацьба ва ўсім сьвеце. Імпэрыялістыя заклікаюць да паходу на Маскву. Аб пралетарскай абароне Масквы гавораць рабочыя мітынгі, дэманстрацыі, грымяць на ўвесь сьвет, ад імя мільёнаў пралетараў, гасьпасы Тэльмана, Кашэна, Готвальда, Жарскага.

Узрастае небясьпека вайны. Абстаноўка створана. Больш, чым калі-б та ні было, Чырвоная армія павінна быць на варце. ЦК УсеКП(б) да 12-й гадавіны Чырвонай арміі кінуў ёй пэўнуг: «Імпэрыялістыя рыхтуюць вайну супроць СССР, антысавецкае цкаваньне ўзмацняецца. Чырвоная армія будзь на варце!» І Чырвоная армія сёньня рапартуе партыі і рабочай клясе, што яна гатова да абароны Савецкага Саюзу, гатова ў бой за пяцігодку, за справу сацыялізму, што яна на варце.

Лёзунгі партыі да 12-й гадавіны вызначаюць асноўныя задачы Чырвонай арміі на 13-ты год яе работы. Партыя патрабуе ад Чырвонай арміі ўсё большае і большае ўвагі да справы баявой падрыхтоўкі, аўладаньня тэхнічнымі сродкамі барацьбы, аўладаньня складанымі формамі сучаснага бою. У гэты пункт б'юць лёзунгі партыі. Пад гэтымі лёзунгамі павінна далей разгортвацца работа арміі, а гэта патрабуе:

1) Камандзірам, паліторганам, партарганізацыям, камсамольцам павярнуцца ўсё больш, усё больш тварам да баявой падрыхтоўкі. Трэба, каб усе часьці, усе кіраўнікі часьцей цьвёрда ўсьвядомілі, што раней за ўсё, перш за ўсё, трэба выканаць і перавыканаць свой плян—плян баявой падрыхтоўкі часьці. Завод, калгас—маюць свае пляны, вайсковыя часьці—свой.

Гэтымі днямі ў друку паведамлялася, што ленінградзкія вайсковыя часьці і вайсковыя школы вылучылі брыгаду для абсьледваньня выкананьня прамфінплянаў заводаў. Гэта можна толькі вітаць, але толькі і выключна толькі ў тым выпадку, калі ў гэтых часьцях выконваецца як след свой упасны плян, плян баявой падрыхтоўкі, плян вучобы і дзеяньняў і калі гэта праверка адбываецца ў няслужбовы час чырвонаармейцаў і курсантаў.

У нас шмат усякіх відаў сацыялістычнага спаборніцтва. Чаму-б шырока не распаўсюдзіць сацдагавор паміж заводам, калгасам, саўгасам, з аднаго боку, і чырвонаармейскай часьцю, з другога, на выкананьне заводам, калгасам сваіх вытворчых праграм, а чырвонаармейскімі часьцямі сваіх—па баявой падрыхтоўцы. Чаму на адказаць рымскаму папе такім масавым заключэньнем дагавароў, дагавароў па выкананьні пяцігодкі ў чатыры гады і забесьпячэньні мірнае працы краю ўсё ўзрастаючай магутнасьцю Чырвонай арміі. Ударнікі заводаў і ўдарнікі Чырвонай арміі—за прамфінплян, за баявую магутнасьць Чырвонай арміі.

2) Чырвоная армія ў мінулым 1929 годзе падрыхтавала на розных курсах каля 100.000 чырвонаармейцаў-адпускнікоў для сацыялістычнага будаўніцтва: 25.000 калгасьнікаў, 15.000 работнікаў наапэрацыі, 11.000 трактарыстых, 13.000 работнікаў нізавога савецкага апарату, 3.000 хатнікаў, 2.000 радыёработнікаў, 3.000 кіномэхнікаў і г. д. Чырвоная армія арганізавала чырвонаармейскія калгасы—41 калгас на плошчы ў 255.000 гэкт. На бягучы 1930 г. Рэвалюцыйным Ваенным Саветам дана дырэктыва падрыхтаваць 100.000 адпускнікоў для актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве вёскі.

Гэта задача будзе выканана, але павінна выконвацца ў дакладнай адпаведнасьці з паказаньнем Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету аб тым, што ні адзін хвіліны за кошт баявой падрыхтоўкі ня можа быць урвана для гэтае справы.

3) Лёзунгі ЦК мабілізуюць увагу краю і арміі на пытаньнях тэхнікі, большага ўкараненьня яе ў армію, мабілізуюць увагу байца, камандзіра і палітработніка на вучобу па аўладаньні тэхнічнымі сродкамі барацьбы.

Тав. Фрунзэ ў 1924 годзе ў прывітаньні 4-му кангрэсу КІМ'у гаварыў: «Тэхніка адна сама па сабе мёртвая. Не яна можа вырашыць лёс заўзятае схваткі, якая будзе мець месца паміж сьветам працы і капіталам. Тэхніка знаходзіцца ў руках чалавека. Што-ж датычыць чалавечага матар'ялу, дык у гэтых адносінах я магу сьмела сказаць, што Чырвоная армія зьяўляецца найбольш магутным, найбольш моцным, баявым інструмантам у руках нашае дзяржавы і ў руках Камуністычнага Інтэрнацыяналу».

За мінулыя 6 год чалавечы матар'ял Чырвонай арміі стаў яшчэ значна лепшым. У арміі ў нас зараз 35 проц. камуністых і камсамольцаў. Рос за гэтыя гады палітычна, культурна і ў баявых адносінах і чырвонаармеец. Расла за гэтыя гады і тэхніка арміі ў сувязі з індустрыялізацыяй краю. Усімі сіламі трэба працягваць вялікую напружаную работу партарганізацыі, паліторганаў, камандзіраў па клясавым выхаваньні, па ўзьняцьці палітычнага і баявога ўзроўню чырвонаармейца над згуртаваньнем арміі пад лёзунгамі партыі.

Сёньня, больш чым калі-б там ні было, трэба ўхапіцца за важнейшае зьвяно—за тэхніку. Сёньня мацней, гучней чым калі-б там ні было павінен гучэць лёзунг—даеш у армію матор, даеш аўтамабіль, танк, самалёт, даеш тэхніку, даеш найбольш сучасную зброю, а ад арміі больш, чым калі-б там ні было, трэба вымагаць—аўладаць тэхнікай, навучыцца кіраваць ёю, усё вышэй узьнімаць тэхнічную культуру байца, камандзіра і палітработніка.

Больш тэхнікі—аўтамабіляў, самалётаў, танкаў у рады Чырвонай арміі, на службу пралетарскай рэвалюцыі.

4) За гэты год ліквідаваліся да канца, ці амаль да канца так званыя «беларуска-талмачоўскія» настрої.

Наша далейшая задача ўсямерна ўмацоўваць аснову асноў будаўніцтва нашай арміі—адзінства, мацнейшую спайку ўсяго начскладу і самую цесную сувязь яго з чырвонаармейскай масай. Вырашна, з усёй рашучасьцю, трэба праводзіць дырэктыву Рэвалюцыйнага Ваеннага савету аб фарсаваньні тэмпу адзінаначальня.

5) А самае галоўнае, самае асноўнае, рашаючае—гэта яшчэ большае згуртаваньне бальшавікоў арміі вакол Ленінскага ЦК.

У барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць апартунізму бальшавікі арміі заўсёды былі наперадзе і стойка змагаліся. Заўсёды былі і заўсёды будуць.

Апошняя чыстка партарганізацый арміі таксама пацьвердзіла, што партыя мае ў арміі моцны баявы атрад бальшавікоў.

Партарганізацыя арміі выканае, як заўсёды выконвала перад партыяй і рабочай клясай, ускладзеныя на яе задачы—умацоўваць баявую магутнасьць Чырвонай арміі.

Гэроям грамадзянскай вайны ордэн Чырвонага Сьцягу

МАСКВА, 22. Па шматлікіх хадайніцтвах раду арганізацый, агульных сходаў рабочых, сялян і чырвонаармейцаў ЦВК СССР пастанавіў узнагародзіць ордэнамі Чырвонага Сьцягу: 2-м—старшыню ЦВК СССР т. Калініна і генэральнага сакратара ЦК УсеКП(б) т. Сталіна; 4-м—наркамваенмора і старшыню РВС т. Варашылава.

Па хадайніцтву Рэвваенсавета СССР і старых байцоў 1-й Коннай арміі ў зьвязку з яе 10-годзьдзем ЦВК СССР пастанавіў узнагародзіць ордэнамі Чырвонага Сьцягу: 3-м—т. Будзённага і 2-м—камандуючага вайскамі Беларускай ваеннай акругі т. Ягорава.

Прывітаньне 1-й Коннай ад т. Сталіна

Прывітаньне байцом 1-й Коннай арміі, якія разграмілі банды царскіх генэраў і выгналі з СССР «цызіізіавых» інтэрвэнтаў.

Прывітаньне арганізатарам 1-й Коннай арміі—т. т. Будзённаму, Варашылаву, Дзенка.

І. СТАЛІН.

ГАВАРЫЦЬ БУДЗЕННЫ, ФРУНЗЭ І ВАРАШЫЛАЎ НА ПАЎДНЁВЫМ ФРОНЦЕ

„Мы стварылі Армію, якая першы раз у гісторыі ведае, за што яна змагаецца“.
ЛЕНІН.

У ДАЗОРЫ НА ЎСХОДНЯЙ МЯЖЫ

Верная традыцыям свайго арганізатара—УсеКП(б), загартаваная ў буры грамадзянскае вайны, магутная, стойкая Чырвоная армія гатова да будучых баёў з сусьветным капіталам

УсеКП(б)--правадыр і арганізатар ўсіх перамог
Сталёвымі радамі—вакол УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК

«Хто ўносіў элемэнты парадку і дысцыпліны ў рады створаных пад гром гарматных стрэлаў нашых маладых чырвоных палкоў? Хто ў гадзіны нядач і паражэньняў падтрымліваў мужнасьць і бадзёрасьць байцоў і ўліваў сваю энэргію ў іх парушаныя рады? Хто наладжваў тыл армії, арганізоўваў там савецкую ўладу і стараў савецкі парадак, забясьпечваючы гэтым хуткі і пасьпяховы рух нашых армій уперад? Хто сваімі намаганьнямі і ўпартаю работаю уносіў разлад у рады ворага, прывозячы ў непарадак яго тыл і гэтым падрыхтоўваючы наступныя посьпехі?

ГЭТА РАБІЛІ ПАЛІТОРГАНЫ!»

ФРУНЗЭ.

Араншам

Праверым баявую магутнасьць

12-я гадавіна Чырвонай арміі прымушае нас больш, чым калі-б там ні было, упомніць пра баявыя традыцыі Чырвонае арміі, пра нашы перамогі на шматлікіх франтох грамадзянскае вайны.

Цэлы рад фактаў з жыцьця буржуазных краін, якія гасьцінна прытулілі эмігрантаў, прымушае асабліва шільна праверыць — ці сухі порах у чырвонаармейскай парахаўніцы.

Зараз, дзякуючы пасьпяховаму выкананьню нашай пяцігодкі, шпаркаму тэмпу росту цяжкой індустрыі краіны, якія стварылі базу для сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, пад кіраўніцтвам партыі, рабочая кляса, апіраючыяся на беднату і ў саюзе з серадняком, прыступіла да ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Кулак — вось апошняя падзея міжнародняй буржуазіі, ліквідацыя кулака — пагібель надзей на разбурэньне Савецкага Саюзу з сярэдзіны. Вось чаму не кругавідзе зьявілася новая здань ваеннай небясьпекі.

Дванаццатая гадавіна Чырвонай арміі зьяўляецца перш за ўсё днём праверкі тэй работы, якую часьці прарабілі за мінулы перыяд.

У гэтым годзе, як і ў мінулым, чырвонаармейскія часьці прынялі самы актыўны ўдзел у справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. Чырвоная армія зьяўляецца ня толькі дастаўшчыкам для новай вёскі тысяч арганізатараў-калгасьнікаў, трактарыстых і іншых будаўнікоў сацыялістычнае вёскі. Сваімі лістамі дамоў чырвонаармейцы канчаткова вырашаюць сумненьні сваіх бацькоў, братоў і сваякоў, якія стаяць часамі на перакрываньні: «ці ісьці ў калгас, ці пачакаць, паглядзець, як жывуць іншыя».

Агранаход часьцей БВА, які даў вялікі штуршок у справе падрыхтоўкі веснавой сяўбы, праведены нашымі часьцямі з вялікім энтузіязмам і посьпехам.

Але ўсё-ж гэта вялікая работа не засланіла сабою асноўнай задачы, што стаіць перад Чырвонай арміяй, — **быць гатовай да абароны нашага Саюзу.**

Пытаньні баявой падрыхтоўкі займаюць першае месца ў жыцьці чырвоных часьцей. Складаныя формы сучаснага бою, забясьпячэньне тэхнікай войск, вялікая рухавасьць — усё гэта патрабуе дасканалага веданьня ваеннае справы. У цэнтры ўсёй сваёй работы партыйныя арганізацыі, паліторгаиы і ўвесь начальніцкі склад Чырвонай арміі стаяць пытаньні баявой падрыхтоўкі. Вакол гэтых пытаньняў разьвіваецца сацыялістычнае спаборніцтва.

Тысячы чырвонаармейцаў абвясьцілі сабе ўдарнікамі і, спаборнічаючы адзін з іншым, вывучаюць ваенную справу. У часьцях зьявіліся ўдарныя разьдзелы, паасобныя часьці абвясьцілі сябе ўдарнымі.

Улічваючы неабходнасьць яшчэ большай мабілізацыі ўвагі вакол пытаньняў баявой падрыхтоўкі, РВС акругі ў сувязі з 12-й гадавінай зьвярнуўся да часьцей з заклікам уліць новыя 10.000 ударнікаў у нашы рады.

Зразумела, гэты заклік сустрэне водгук у часьцях.

Сацыялістычнае спаборніцтва разгортваецца вакол канкрэтных пытаньняў баявой падрыхтоўкі: лепшага захаваньні зброі, меткага страляньня, лепшай рубкі, лепшага захаваньня абмундзіраваньня і г. д., і г. д.

Актыўнасьць чырвонаармейца, які ў сваёй большасьці прышоў з вёскі, дзе ён прымаў удзел у непасрэдным барацьбе вакол калгасу, у чыстцы партыі і савецкага апарату, накіроўваецца ў рэчышча баявой падрыхтоўкі. Успаміны аб баявым мінулым, аб перамогах Чырвонай арміі, ня толькі замацуюць посьпехі мінулага году, але будуць штуршком у справе ўдасканаленьня яшчэ больш хуткім тэмпам вайсковай вучобы. Гэты штуршок павінен дапамагчы канчаткова зжыць тыя слабыя месцы і недахопы, якія маюць яшчэ месца ў жыцьці і баявой вучобе часьцей.

Абароназдольнасьць краіны цесна зьвязана з магчымасьцю нашага Саюзу ў выпадку вайны абарнуцца ва ўзброены лягер, згуртаваны адным агульнай думкай — перамагчы ўсіх тых, хто на нас напаў.

Паміма наяўнасьці гатовых баяздольных, ведаючых ваенную справу рэзэрваў, гатовых у кожны момант папоўніць рады Чырвонай арміі ў часе баёў, нам трэба дабіцца, каб любы рабочы або работніца, якія працуюць па заводзе, у кожны момант маглі ўзяцца за зброю.

Адсюль вялізная работа па ваяніза-цыі ў першую чаргу пралетараў.

У XII гадавіну Чырвонай арміі, на вечарох, прысьвечаных перамогам грамадзянскай вайны, трэба праверыць гэту сувязь, трэба праверыць, як абстаіць справа з баявой падрыхтоўкай рабочых, членаў партыі, камсамольцаў.

Перад тварам падзей, якія адбываюцца, XII гадавіна павінна прайсьці пад лёзунгам праверкі баявой падрыхтаванасьці часьцей, пад лёзунгам падрыхтоўкі працоўных да абароны завяваньняў вялікага Кастрычніка.

Уншліхт

ДА 12-Й ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЕ АРМІІ

Гіганцкія зрухі адбываюцца ў гаспадарцы нашага краю. Суцэльная калектывізацыя цэлых раёнаў, округ, абласьцей кладзе канец дробнай індывідуальнай сялянскай гаспадарцы. Ліквідуецца кулацтва, як кляса. Пад кіраўніцтвам рабочае клясы, батрацкія і бядняцка-середняцкія копы вёскі пачынаюць жыць пановаму, думаць інакш. Адбываецца працэс уздыму змычкі рабочае клясы і бядняцка-серадняцкае вёскі на вышэйшую ступень. Пашыраецца і паглыбляецца база будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі. Чырвоная армія атрымлівае 100-процантны набор для падрыхтоўкі вытрыманых, стойкіх байцоў. Гіганцкі рост усяе гаспадаркі, дзякуючы напружаньню ўсіх нашых сіл, сродкаў і магчымасьцяй, вялізарнай актыўнасьці. Ініцыятывы і самадзейнасьці пралетарскіх мас, абганяе ўсе нашы пляны і меркаваньні. З аграрнага краю СССР у гістарычна кароткі час ператвараецца ў край індустрыяльны.

Гэтыя нячуваныя зрухі дазваляюць нам з кожным годам усё больш грунтоўна забясьпечыць нашу Чырвоную армію новымі дасягненьнямі ў галіне ваеннае тэхнікі.

І так кожны год прыносіць нам буйнейшыя дасягненьні ў галіне ўздыму якасьці людзкіх кантынгентаў ва ўдасканаленьні ваеннае тэхнікі РСЧА. Але ні людзкі склад сам па сабе, ні сама па сабе высокая ваенная тэхніка не вызначае яшчэ баяздольнасьці ўзброеных сіл. Неабходна поўнае ўзаемадзеяньне чалавека і машыны. Трэба, каб баец ведаў ваеннае мастацтва, ведаў і тэхніку, якая яму дана, як сродак вядзеньня вёскі. Трэба, каб камандзір умеў кіраваць сваёй часьцю, умеў кіраваць рознымі тэхнічнымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яго распараджэньні; як камандзіру, так і байцу патрэбны палітычная сьвядомасьць, байцу патрэбны палітычная сьвядомасьць, вытрыманасьць, загартаванасьць, цьвёрдая воля, рашучасьць.

Выконваючы гэтыя патрабаваньні, мы ствараем маналітную, першакласную сілу. Такое арміі ня можа рушыць супроць нас капіталістычны сьвет. Наша армія змагаецца і памірае за свае інтарэсы, буржуазныя арміі змагаюцца ў імя інтарэсаў сваіх клясавых ворагаў, змагаюцца пад прымусам. А міжнародная абстаноўка такая, што мы павінны павялічыць нашы намаганьні ў дзесяць раз, каб узьняць яшчэ на новую, яшчэ больш высокую ступень нашу абароназдольнасьць, нашу боягатоўнасьць.

Крызіс у капіталістычных краёх, які ўсё завостраецца, цягне за сабою гіганцкі рост беспрацоўя, рэзкае пагоршаньне становішча рабочае клясы. Абвастраюцца ўсё мацней, усё разчэй клясавыя супярэчнасьці, быстра ўзрастае рэвалюцыйны рух і ўсё шырэй ахапляе працоўныя масы. Рабочая кляса захватвае вуліцу. Разгортваюцца авангардныя баі. Рабочыя дэманстрацыі бязьлітасна расстрэльваюцца, турмы перапоўнены, голад стукаецца ў дзьверы кватэр пралетараў. Падзеі хутка разгортваюцца. Нашы посьпехі, грандыёзны размах сацыялістычнага будаўніцтва захвочвае рабочую клясу капіталістычных краёў, прыгнечаныя народы калоній і поўкалоній. Капіталістычны сьвет кідаецца ва ўсе бакі, адчуваючы сваю нямінучую гібель. Капіталістычны сьвет мабілізуе ўсе свае сілы і сродкі, каб хуткім кароткім ударам у патоках крыві затапіць рэвалюцыйную хвалю, каб шырокім узброеным фронтам пачаць супроць нас наступленьне, спадзяючыся разбурыць вогнішча сусьветнай рэвалюцыі.

Яшчэ да рэвалюцыі «ў ваенная праграме пралетарскае рэвалюцыі» Ўладзімір Ільліч пісаў: «Сацыялізм ня можа перамагчы адначасна ва ўсіх краёх. Ён пераможа першапачаткова ў адным або некалькіх краёх, а іншыя на працягу не каторага часу застануцца буржуазнымі або дабуржуазнымі. Гэта павінна выклікаць ня толькі трэньні, але і проставе імкненьне буржуазіі іншых краёў да разгрому пераможнага пралетарыяту сацыялістычнае дзяржавы... Гэта была-б вайна за сацыялізм, за вызваленьне іншых народаў ад буржуазіі». Падзеі бліскуча пацьвярджаюць усю сілу, усю правільнасьць ленінскага аналізу.

Які павінен быць наш адказ на выклік капіталістычнага сьвету?

Задача заключаецца ў тым, каб Савецкі ўрад вёў і надалей цьвёрда і непахісна палітыку міру, палітыку мірных адносін, ня гледзячы на правакацыйныя выпады нашых ворагаў, ня гледзячы на ўколы па нашым прэстыжы. Нас дразьняць і будуць дразьніць правакатары з варожага лягеру, сьцьвярджаючы, што наша мірная палітыка тлумачыцца нашай спабасьцю, спабасьцю нашай арміі. Гэта ўзрывае часамі сяго-таго з нашых таварышоў, здольных паддацца правакацыі і патрабуючых прыняцьця «рашучых» мер. Гэта спабасьць нэрвых мер. Мы ня можам і не павінны граць пад дудку нашых ворагаў. Мы павінны ісьці сваім шляхам, бароначы справу міру, дэманструючы сваю волю да міру, выкрываючы грабежніцкія намеры нашых ворагаў і выстаўляючы іх, як зачыншчыкаў вайны. Бо такая палітыка можа даць нам магчымасьць сказаць працоўным масы СССР у адзіны баявы лягер, калі вораг навяжа нам вайну. «Задача заключаецца ў тым, каб узьняць абароназдольнасьць нашага краю, уздымаць нашу народную гаспадарку, паляпшаць нашу прамысловасьць, ваенную і неваенную, узьнімаць пільнасьць рабочых, сялян і чырвонаармейцаў нашага краю, загартоўваючы ў іх волю абароны сацыялістычнае бацькаўшчыны» (Сталін «Заметкі на сучасныя тэмы»).

Мы працягваем палітыку міру, але гатовы ўзброенай рукой абараняць вялізарныя завяваньні Кастрычніка. На нашым баку ня толькі ўсе працоўныя Савецкага Саюзу, мы маем на сваім баку рэвалюцыйную армію мільёнаў працоўных усіх краёў, якая гатова адказаць руйнуючым ударам узброенай атацы ўсіх сіл сусьветнае контр-рэвалюцыі супроць СССР, на нашым баку спачуваньні і сымпатыі пралетарыяту ўсяго сьвету.

Але ўсё гэта нас не павінна супакойваць. У 12-ю гадавіну гэраічнае Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі яшчэ раз напомнім усім чырвонаармейцам, усяму камандному складу: не марнуйце ні мінуты—удасканальвайце свае ваенныя веды, будзьце гатовы да баявых выпраба ньняў.

Усю рабочую клясу, усіх працоўных мы яшчэ раз заклікаем—аказвайце максымальную дапамогу справе абароны, павялічвайце свае намаганьні ў дзесяць раз у справе будаўніцтва сацыялізму. Адными сіламі Чырвонае арміі мы ворага не пераможам. Чырвоная армія, актыўна падтрыманая ўсёй краінай, усёй савецкай грамадзянскаю, пад кіраўніцтвам ленінскае партыі,—вось сіла, якая зьнішчыць усе перашкоды, якія выкананьню сваю гістарычную місію да канца.

ПРАЛЕТАРЫ, НА КАНЯ!

ВУЧЫСЯ, ПІЯНЭР, ПЕРАМАГАЦЬ...

Пад сьцягам ленінскай нацпалітыкі

Гаворачы аб Чырвонай арміі, як аб апоры пралетарскай дзяржавы, нельга не адзначыць вялізарнай ролі нацыянальнага будаўніцтва — гэтага важнейшага фактару, які вызначае палітычную стойкасьць арміі і ўзмацняе яе баяздольнасьць у цэлым.

Зьяўляючыся часткай нацыянальнай палітыкі партыі і савецкай улады, нацыянальнае будаўніцтва ў Чырвонай арміі базуецца на агульных прынцыпах, якія выцякаюць з праграмных установак УсеКП(б).

Упяршыню ў сьвеце працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу атрымалі сапраўдную роўнасьць ва ўмовах вайсковай арганізацыі, упяршыню яны атрымалі магчымасьць са зброяй у руках абараняць свае клясавыя інтарэсы. Упяршыню ў гісторыі армія выступае, як адна з магутнейшых сродкаў інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас.

12-ю гадавіну вайсковыя часьці, размешчаныя на тэрыторыі БССР, разам з усёй Чырвонай арміяй сустракаюць ва ўмовах вялікіх посьпехаў у галіне нацыянальнай работы як па лініі беларусізацыі, так і па лініі работы з чырвонаармейцамі нацыянальных меншасьцяй. Дасягненьні гэтыя выказваюцца ў агульным няўхільным узмацненьні беларускіх нацыянальных фармаваньняў, у пашырэньні матар'яльнай базы нацработы, росьце камандных кадраў з карэннага насельніцтва, паралельце, у паляпшэньні пастаноўкі работы ўсёй выхаваўчай работы.

Вайсковыя партарганізацыі, разам з усёй КП(б)Б, далі належны адпор усім скажэньням лініі партыі ў нацпытаньні, вядучы бязьлітасную барацьбу з праявамі беларускага нацыянал-дэмакратызму, вялікадзяржаўнага шавінізму, антысэмітызму і шавінізму ўсіх колераў.

Вайсковая партарганізацыя і далей будзе няўхільна ажыцьцяўляць ленінскую нацпалітыку, будзе паглыбляць беларусізацыю, нясупынна выхоўваць чырвонаармейскія масы ў інтэрнацыянальна-клясавым духу.

Чырвоная армія зьяўляецца сапраўдным баявым саюзам працоўных усіх нацыянальнасьцяй. У гэтым яе сіла, у гэтым яе магутнасьць.

Б. П.

За новыя тэмпы, за якасьць

12-я гадавіна Чырвонай арміі праходзіць у момант буйнейшых зрухаў у міжнароднай і ўнутранай абстаноўцы нашай краіны.

Усё гэта абавязвае нас быць на варце, узмацніць сваю пільнасьць да пытаньняў абароны.

Ня кажучы ўжо аб неабходнасьці ўзмацненьня баявой падрыхтоўкі і баявой магутнасьці Чырвонай арміі, трэба зрабіць рашучы крок у галіне ўзмацненьня вайсковае падрыхтоўкі грамадзянскага насельніцтва праз арганізацыі Асоавіяхіму.

Асоавіяхім зьяўляецца буйнейшаю грамадзкаю арганізацыяй у нашай краіне, якая прызвана нашай партыяй і савецкай уладай умацоўваць абарону краіны.

Але ў рабоце гэтай арганізацыі бясьць рад слабых і вузкіх месц. Асноўны недахоп асоавіяхімаўскай работы заключаецца ў тым, што яна ня здолела перабудавацьсваёй работы ў адпаведнасьці з вялізарнымі задачамі новай паласы, у якую ўступіла наша краіна, што яна ня здолела прыстасавацца да новых задач, тэмпаў і мэтадаў работы. Пераход заводаў на бесьперапынку, на шматзьменную работу не знайшлі адбітку ў практычнай рабоце пілаых арганізацый т вт, у сувязі з гэтым у многіх ячэйках работа развалілася. Яшчэ менш зроблена ў справе прыстасаваньня работы ў вёсцы, у сувязі з калектывізацыяй сельскае гаспадаркі. Сацыялістычнае спаборніцтва яшчэ ня стала асноўным мэтадам работы т-ва.

Перажываны перыяд патрабуе ад арганізацый Асоавіяхіму новых тэмпаў і мэтадаў работы. Самакрытыка, самаправерка і сацыялістычнае спаборніцтва павінны стаць асноўным мэтадам работы Асоавіяхіму.

У рабоце на фабрыках і заводах належыць прыстасавацца да бесьперапынкі, зьменнасьці работы, у сувязі з гэтым частку навучальна-практычнай работы прыдзецца вынесьці са сьцен заводаў шляхам арганізацыі навучальна-страявых адзінак пры паўных базах для аднае і тае-ж зьмены групы заводаў і фабрык.

Вялікую ролю ў гэтай справе павінны адыграць рабочыя клюбы, якія павінны стаць асноўнымі базамі для вайсковай падрыхтоўкі членаў прафсаюзаў і ў адпаведнасьці з гэтым перабудаваць сваю работу, прыстасаваўшы да гэтага вайсковыя куткі, бібліятэкі і г. д.

У сельскіх мясцовасьцях належыць узяць ўстаноўку на саўгас і калгас. Выкананьнем задачы аб арганізацыі ў кожным саўгасе і калгасе ячэйкі Асоавіяхіму зараз абмежавацца не ўльга. Калектывізацыя адкрывае вялізарнейшыя магчымасьці ў справе разгортваньня практычнай работы па ваяніза-цыі сельскага насельніцтва.

У саўгасах і калгасах, якія ўжо ўмацаваліся, належыць перанесьці мэтады работы заводзкіх ячэек, у прыватнасьці прыступіць да арганізацыі вучэбна-страявых адзінак.

Паміма таго арганізацыі Асоавіяхіму ў вёсцы павінны прарабіць вялікую работу ў галіне хэмізацыі сельскае гаспадаркі. Пратручваньне насельня, барацьба са шкоднікамі сельскае гаспадаркі, адшуканьне сродкаў угнаеньня з мясцовага матар'ялу належыць у асноўным ускласьці на арганізацыі Асоавіяхіму, а апошнія павінны прыстасаваць сваю работу да выкананьня гэтых задач, арганізуючы спэцыяльныя сэкцыі і атрады пры ячэйках, падрыхтоўваючыя спэцыяльныя кадры ў якасьці арганізатараў і кіраўнікоў гэтае работы.

Усе гэтыя задачы будуць выкананы арганізацыямі Асоавіяхіму, калі будзе ўзмоцнена ўвага з боку партыйных органаў, прафсаюзаў і камсамольскіх арганізацый да работы Асоавіяхіму да пытаньняў ваяніза-цыі.

Да 12-й гадавіны Чырвонай арміі ўвага рабочае клясы і працоўных будзе яшчэ больш прыцягнута да пытаньняў узмацненьня абароны. Неабходна правесьці рад арганізацыйных мерапрыемстваў, каб ад гэтай кампаніі перайсьці да штодзённай практычнай работы па ўзмацненьні абароны краіны.

ВАСЬКОВІЧ

Партыйная арганізацыя Чырвонай арміі

Колькаснасьць партарганізацыі на 1 студзеня 1928 году—82.018 чалавек, на 1 студзеня 1929 г.—93.330 чал., на 1 ліпеня 1929 г.—110.793 чал.

Рост партарганізацыі: за 1927 год прынята ў партыю 29.537 кандыдатаў, за 1928 г.—37.992 і за 9 мес. 1929 г.—35.831 кандыдат. Як відаць з гэтых лічбаў, крывая росту ўвесь час ідзе ўверх. Паляпшаецца і сацыяльны склад прымаемых у партыю, што відаць з наступнай табліцы.

	Рабочых	Сялян	Служ. і інш.
1926 г.	31,0	63,6	5,4
1927 г.	36,0	59,5	4,5
1928 г.	48,9	47,9	3,2
1929 г.	68,0	31,1	0,9

А. І. ЯГОРАЎ

12 год Чырвонае арміі і нашы чарговыя задачы

Мы кожны год адзначаем гадавіну нашай Чырвонай арміі і вызначаем далейшыя задачы па ўдасканаленьні і ўзмацненьні баявой магутнасьці яе радоў. Зразумела, што гэтыя задачы не стаяць па-за ўлікам тэй абстаноўкі і тых умоў, у якіх жыве і працуе наш Савецкі Саюз, і тэй міжнародняй абстаноўкі, якая стваецца на рубяжы кожнай не гадавіны. Улік палітычных, эканамічных, сацыяльна - клясавых і гаспадарчых зьявішч і фактараў, як знутры нашай краіны, так і па-за ёю служыць адпраўной базай для пастаноўкі арміі канкрэтных задач у галіне яе вайсковай і палітычнай падрыхтоўкі.

Якія асабліва зьявішчы маем мы ў галіне ўнутранога і міжнароднага становішча Савецкага Саюзу да дня 12-е гадавіны нашае Чырвонае арміі, які іх унутраны аналіз і якія вывады мы павінны ставіць перад сабой на аснове гэтага аналізу да вызначэньня як курсу, так і задач нашае работы.

Унутранае становішча

Бягучы год зьяўляецца другім годам пяцігодкі нашага сацыялістычнага будаўніцтва. У пасьлядні ўсе паказальнікі, што вызначаюць пяцігодку работ мы зможам выканаць за значна меншы тэрмін, а іменна — за 4 гады. Энтузіязм рабочае клясы ў пяцігодцы, трэба толькі здолець нашым гаспадарчым і прафсаюзным органам ахапіць гэты ўздым і накіраваць яго па правільным шляху выторчага працэсу. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі на аснове калектывізацыі разьвіваецца ў гэты час нячуваным тэмпам. Трэба проста сказаць, што мы ўступілі ў паласу рашучага пералому сацыяльна - клясавых і палітыка - эканамічных узаемадносін у нашай краіне. Масавая і сацыяльная калектывізацыя раёнаў, округ і цэлых абласьцей зусім натуральна зьяўляецца адпраўной базай для такога вялізарнага па сваёй важнасьці палітычнага акту ліквідацыі кулацтва, як клясы. Наша партыя з усёй рашучасьцю паставіла і правядзіць задачу выкарчоўваньня карэньню капіталізму ў нашай краіне. У сучасных умовах разьвіцьця нашага сацыялістычнага будаўніцтва кулак, як капіталістычны сэктар вёскі, зьяўляецца найбольш важным па сваім значэньні фактарам, які стаіць на шляху ажыцьцяўленьня нямі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Вось чаму на аснове новага курсу палітыкі нашай партыі ў вёсцы, савецкая ўлада ўхваліла рад мер і выдала дэкрэт аб анулываньні закону аб арэндзе зямлі, найме рабочае сілы Бясспрэчна, гэтыя мерапрыемствы выклікаюць крайняе абастрэньне клясавай барацьбы ў нас у краіне. Гэта партыя і савецкая ўлада ясна сабе ўяўляюць і ўлічваюць. Аднак, пастаўленая задача ліквідацыі кулацтва, як клясы, будзе выканана.

Чырвоная армія, палітычна выхоўваны і навучаючы байцоў, будзе усяляк дапамагаць партыі і савецкай уладзе ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, імкнучыся ахапіць калгасным рухам пагадоўна ўвесь свой наяўны склад байцоў, якія працуюць або жадаюць працаваць на сяле.

Міжнародная абстаноўка

Рост сацыялістычнага будаўніцтва нашае краіны, выкананьне намі вызначанай пяцігодкі і калектывізацыя нашае вёскі, якая разгортваецца набачаным тэмпам, выводзіць з роўнавагі нашых клясавых ворагаў — буржуазію і капіталістых. Хваля рэвалюцыйнага рабочага руху, якая ўздымаецца ў краінах капіталізму, служыць паказальнікам абастрэньня клясавых супярэчнасьцяй паміж працаю і капіталам. Ва ўсіх капіталістычных краінах сьвету можна адзначыць эканамічны крызіс, упадак прадукцыйнасьці прамысловасьці, адсюль рост беспрацоўя, скарачаньне платных рабочых дзён у тыдзень і г. д.

Правадзімая капіталістычная рацыяналізацыя заснавана на паньлічэньні ліку гадзін рабочага дня, на потагонных спосабах вытворчасьці, на шырокім дастасаваньні бязьлітаснай эксплёатацыі працы падрострыў і калёніяльных рабоў. Капіталізм з рамак «часовай стабілізацыі» ляціць уніз на шляху свайго распаду і краху. Буржуазія і капіталістыя ў той-жа час ня могуць вырашыць супярэчнасьцяй, якія пасьпяваюць паміж асобнымі краінамі на глебе канкурэнцыі, прыгнечаньня і грабежніцтва малых краін, барацьбы за рынкі збыту і за рынкі сырцу. Усе гэтыя фактары невыгадальных супярэчнасьцяй паміж асобнымі капіталістычнымі краінамі насумненна зьяўляюцца стрымліваючым пачаткам у пытаньні ўзброенага нападу сусьветнага капіталу на нашу краіну. Усе пералічаныя вышэй умовы і фактары, а іменна: абвастрэньне эканамічнага крызісу і клясавых супярэчнасьцяй і ўздым рэвалюцыйнай хвалі сярод рабочых мас выклікаюць у буржуазіі і капіталістых жывёльны страх і боязьнь перад магчымасьцю пралетарскае рэвалюцыі ў іх краінах. Адсюль шалёны рост антысавецкай кампаніі амаль ва ўсіх краінах сьвету пад знакам яких-небудзь поваду, накіталт таго, што нашы паўнамоцныя і гандлёвыя прадстаўніцтвы не займаюцца нічым іншым, як толькі агітацыяй і прапагандай, значыцца, трэба іх закрыць і парваць з намі дыплёматычныя адносіны. Або выстаўляецца такога роду правакацыйны матыў, што нашая ДПУ нібыта ўкрала генэрала Куцепава, заклала контр - рэвалюцыянэра і ворага Савецкае ўлады, які біўся пра усю грамадзянскую вайну з Чырвонай арміяй на паўднёвым фронце, камандуючы добраахвотніцкімі часьцямі. Асабліва шаленствуе па гэтым пытаньні французкі буржуазны друк, які заклікае ня толькі да простага разрыву дыплёматычных адносін, але і да ўзброенай барацьбы з намі. У той-жа час буржуазія апраўдвае ў сваім судзе ўсіх агідзікаў і машэньнікаў, ня гледзячы на тое, што гэтыя людзі падрабляюць савецкія пэксалі, друкуюць нашы чырвонцы, фабрыкуюць розныя фальшывыя дакуманты і г. д. Сацыялістыя ўсіх краін і колераў, у тым ліку і асабліва нямецкая сацыял-дэмакратыя з усім нутром перайшлі на службу сваёй буржуазіі і выпярэджваюць яе ў вычварных мэтадах барацьбы і расправы з камуністычнымі партыямі і найменшым праўяленьнем рэвалюцыйнага руху рабочае клясы ў сваіх краінах.

Побач з гэтым мы бачым на Лендзінскай канфэрэнцыі ня прыкрыты гандаль аб разьмерах байскова - морскага флёту. Кожная буржуазная дзяржава стараецца атрымаць мандат на такі флёт, які-б гарантаваў ёй у адзіночку перамогу над іншай, а будучы ў блёку з кім-небудзь, давай-бы перагану над флётам самай вялікай морская дзяржавы.

Так праходзіць гэта «сьвістапляска» спаравяньня морскіх узбраеньняў. Між тым, рост узбраеньняў ідзе шалёным тэмпам. Ліхаманкава працуюць генэральныя штабы ўсіх дзяржаў сьвету, выпрацоўваючы розныя праекты вайсковых саюзаў асобных дзяржаў паміж сабою і арганізуючы блёк з раду дзяржаў супроць якое-небудзь трэцяй краіны. У гэтых адносінах характэрны апошнія весткі, якія цесна зьвязаны з паездкай Эстонскага прэзыдэнта Штрандмана. Вакол гэтай паездкі стварылася пыхат шуму, але сярод гэтага шуму, нават нявуброеным вухам ясна чутны тры знаёмыя словы — «Прыбальтыцкі ваенны саюз». Якія-б ня былі ў далейшым тлумачэньні з боку дзяржаўных дзеячоў гэтых краін, але мы да 12-ай гадавіны Чырвонай арміі можам і павінны запісаць у блёкнот міжнароднай абстаноўкі наяўнасьць ваеннага саюзу паміж Латвіяй, Эстоніяй і Фінляндыяй пад кіраўніцтвам Польшчы. Нам абсалютна няма патрэбнасьці рабіць тут аналіз, супроць каго накіраваны гэты ваенны саюз, бо за гэта гаворыць любая геаграфічная карта. Мы можам толькі дадаць, што закончаны і адкрыты гэтымі днямі румынамі ў прысутнасьці прадстаўнікоў польскае дзяржавы чыгуначны мост праз раку Днестр ля Залешчыкаў прадстаўляе сабою ня толькі просты чыгуначны шлях паміж Румыніяй і Польшчаю, але, трэба думаць, зьяўляецца і стыкам трафіка вайсковых перавозак паводле плану генэральных штабаў гэтых дзяржаў. Румынія ляжыць на Дунаі, а ня ў Прыбальтыцы. Само сабою зразумела, знаходзіць проста ў «Прыбальтыцкі ваенны саюз» ня пяручна, вельмі ўжо будуць адкрыты карты такога «паўночнага варыянту». Значна прасьцей і менш прыкметна пабудаваць рад чыгуначных мастоў праз Днестр на ўсім працягу граніц Румыніі і Польшчы і перакінуць праз іх прахолны і просты шлях з тэрыторыі аднае дзяржавы на тэрыторыю другое. Якая камэ да гэтага справа? А калі хто і спытаецца — заўсёды ёсьць гатовы і «важкі» адказ — «эканамічнае «тяготеніе» прыяцкіх раёнаў». Яно, зразумела, «тяготеет», але вось што і да чаго гэтае пытаньне. На наш погляд просты чыгуначны шлях з Польшчы ў Румынію зьяўляецца комунікацыйным маршрутам для балыога забясьпячэньня Румынскай арміі за кошт эўрапэйскіх краін (а можа адпоўкам забясьпечваецца і Амэрыкай) праз польскі порт Гдыню.

Усе гэтыя моманты міжнародняй абстаноўкі прымушаюць нас перш за ўсё глыбока іх прааналізаваць і зрабіць наступны вывад:

1) Пасьпяховае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне моцна непакоіць нашых клясавых ворагаў ва ўсім сьвеце.

2) Абастрэньне клясавых супярэчнасьцяй, эканамічны крызіс і ўздым рэвалюцыйнай хвалі рабочага руху ўнутры капіталістычных краін побач з жывёльным страхам перад пралетарскай рэвалюцыяй, выклікае ў капіталістых яшчэ больш шалёную ненавісьць да бальшавікоў і арганізацыю ўзброенага нападу на наш Саюз з мэтаю задушэньня Савецкай улады.

3) Шалёная кампанія цкаваньня напоўнамоцных прадстаўніцтваў і цэлы рад грубых антысавецкіх выпадаў у розных краінах, вобыскі ў нашым паўнамоцным прадстаўніцтве ў Мэксыцы і ў гандлёвым прадстаўніцтве ў Нямеччыне, абвінавачаньне савецкай улады ў ашуканьстве на рэлігію і ў пакражы генэрала Куцепава і патрабаваньне на аснове гэтых матываў разрыву з намі дыплёматычных адносін, гэта падрыхтоўка і фармаваньне грамадзкае думкі для арганізацыі адзінага фронту супроць Савецкае краіны.

4) Свае барацьбу супроць нас капіталізм вядзе на прынцыпе пасьлядоўнасьці, а іменна: а) спачатку згуртаваць грамадзкую думку і наладзіць так званую «маральную блёкаду». Гэта мерапрыемства разгорнута ў даны час вельмі шырока; б) разам з гэтай «маральнай блёкадай» мы бачым вельмі вострую барацьбу, якая праяўляецца капіталістымі на эканамічным фронце. Яны свой удар накіроўваюць на тое, каб падарваць, напрыклад, выхад нашай нафты ды лесу, запалак на заграніцны рынак. У гэтай барацьбе яны асабліва нападаюць на нашыя органы замежнага гандлю з мэтаю прымусіць нас адмовіцца ад аднаго з галоўных вагароў пралетарскае дыктатуры Наркамгандлю, як органу, што кіруе ўсёй нафаполіяй замежнага гандлю. Ясна, куды яны закідваюць вудачку, пракладваючы просты шлях міжнароднаму капіталу да прыватна - капіталістычнага сэктару ў нашай краіне... Наколькі мы верныя прынцыпам Кастрычніцкай рэвалюцыі ні на якія ўступкі ня ідзем, кажучы, падводзячы іх пад дзеяньне «кулямётнага, вінтовачнага і рэвальвэрнага, а можа здарыцца, і артылерыйнага закону».

Патранае, адной з прычын труднасьцяй гэтай меры зьяўляецца таксама і пытаньне стану арміі тэй ці іншай краіны як з пункту погляду палітычнага паладку, так і матар'яльнага яе забясьпячэньня.

Палітычны бок стану арміі бясспрэчна моцна прымушае думаць буржуазію. У гэтым пытаньні мы спатыкаем тыя-ж аналітычныя моманты, як і ў стане рабочага пытаньня. Армія, якая камплектуецца на агульнай вайсковай павінасьці,—армія масавая. Яе сацыяльна-клясавы твар не дае капіталістым упэўненасьці ў поўнай яе надзейнасьці. У сілу гэтага амаль ва ўсіх буржуазных краінах побач з рэгулярнай арміяй існуюць рознага роду далатковыя арганізацыі, часамі па сваёй колькасьці нікольні ня меншыя пасталяннай арміі, як напрыклад, у Польшчы нядаўна арганізавана «Фэдэрацыя саюзаў абароны айчызны», якая аб'ядная амаль усе асобна існаваўшыя вайсковыя, нацыянал-патрыётычныя і фашысцкія арганізацыі з агульнай колькасьцю у 320.000 чалавек. Гэта вялізарная армія заядлых абаронцаў буржуазна-капіталістычных інтарэсаў. У іншых краёх, напрыклад, у Італіі, там адначасова з арміяй утрымліваецца ня меншая па колькасьці фашысцкая міліцыя, якая у схватках з рабочаю клясаю і прадоўным сялянствам ня раз ужо даводзіла сваю адданасьць залатому мяшку буржуа і памешчыкаў. Вось чаму ў галовах вайсковых пісьменьнікаў буржуазных арміі блукае думка аб стварэньні малых жуазіі «прафэсыянальных, набмных армій». У нас абрся выдаецца толькі прадоўным для абароны сваіх правоў, затаму нам няма чаго базіцца агульнай вайсковай павінасьці, бо ў Чырвонай арміі служыць мае права толькі працоўны

Мы за масавую армію, яна наш гонар і наша сіла

У адносінах пытаньняў матар'яльнага забясьпячэньня армії, арганізацыі забясьпечыць свае армії для вядзеньня нават працяжнай вайны. Што-ж даты-чыць дробных дзяржаў, у прыватнасьці Латвіі, Эстоніі,

КОЖНЫ ГОД ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ДАЕ ТЫСЯЧЫ ПАДРЫХТАВАНЫХ БАЙЦОЎ за САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАБУДОВУ ВЁСКІ

У 1929 годзе Чырвоная армія дала вёсць

30.000 калгасьнікаў,
9.000 трактарыстых,
6.000 нізавых савецкіх работнікаў,
2.000 хатнікаў

Чырвонаармейцы-адпускнікі арганізавалі ў розных раёнах Савецкага Саюзу 150 чырвонаармейскіх камун.

Чырвонаармейцы-адпускнікі працуюць у калгасах, дапамагаюць іх арганізоўваць, зьяўляюцца пачынальнікамі калектывізацыі вёскі.

Першая конная армія

Наўрад ці знойдзецца такі глухі куток Савецкага Саюзу, куды-б не дайшлі чуткі аб гэраічных учынках гэтай слаўнейшай з слаўных часьцей Чырвонае арміі. (Фрунзэ).

Разам з усёй Чырвонай арміяй сьвяткуе першая конная сваё 10-цігадовае існаваньне.

У стэпах Паўночнага Каўказу і Дона, у дні жорсткай клясавай барацьбы нарасла грозная Першая Конная.

Батрацкія, бядняцка-серадняцкія мамы інагародніх, лепшыя прадстаўнікі працоўнага казацтва падняліся на барацьбу за зямлю, за савецкую ўладу, супроць кулакоў, пэпманаў і генэралаў, стыхійна ствараючы партызанскія атрады, вылучаючы сваіх чырвоных вайскавадаў.

Вясною 1918 году ўжо было некалькі дробных кавалерыйскіх атрадаў Будзённага, Нікіфарава, Думенкі і інш., якія прынялі на сябе ўвесь цяжар ударaў белагвардзейскіх банд на Паўночным Каўказе.

Агонь грамадзянскае вайны распальваўся. Чырвоныя атрады ясна зразумелі, што ім трэба зьвязацца між сабою, аб'яднацца, і на працягу лета 1918 году яны зьліваюцца і перабудоўваюцца ў рэгулярныя часьці.

У той час камандаваньне ўсімі ўзброенымі савецкімі сіламі поўнаю было ўскладзена на тав. Варашылава і ён, аб'яднаўшы гэтыя атрады, пачёў наступленьне на Вялікакняскую, а потым зьвёў усе гэтыя часьці ў 10 армію, дзе членамі Рэвваенсавету арміі былі т. т. Сталін і Мінін.

10-я армія ў той час была самай магутнай арміяй. Гэта яна ў працягу многіх месяцаў адбівала ярыя атакі белых і гэраічна абараняла Царыцын.

Вось з гэтай партызанскай коньніцы сельскае акругі і стварылася 4-ая кавалерыйская дывізія пад камандаваньнем тав. Будзённага, затым узьнікае 1-я Стаўропальская — у будучым 6-я Чангарская кавдывізія.

У сярэдзіне 1919 году 4-я і 6-я дывізіі аб'ядноўваюцца ў конны корпус паўднёвага фронту — на чале з тав. Будзённым.

* *

17-га жніўня Дзянікін кінуў у рэйд конны корпус генэрала Мамантава. Спальваючы склады, руйнуючы чыгункі, зьверскі расстрэльваючы камуністых —коньніца Мамантава шпарка прасоўвалася да Яльца, ствараючы пагрозу Туле.

10-ая армія, якою ў гэты час камандаваў тав. Ягораў, вымушана была пакінуць Царыцын і арміі паўднёвага фронту пад націскам белых адступалі.

Правадыр і арганізатар перамог—камуністычная партыя, кінуўшы на фронт дзесяткі тысяч сваіх лепшых членаў сцэмэнтавала, зьлітавала часьці Паўднёвага фронту. Выў створаны мощны кулак з сьвежых часьцей, узмацнілася пралетарскае кіраўніцтва, якое стварыла моцнае партыйнае ядро ў часьцёх Паўднёвага фронту, у тым ліку—у 1-й конной.

Пералом стаўся. Камуністы запальвалі чырвоныя часьці воляю да барацьбы і перамогі і непагасны клясавы энтузіязм байцоў даў нам перамогу.

Асобная вайсковая група ў раёне Кро-

Польшча баявое харчаваньне ў 1920 годзе і водасей добра і зараз, з якіх крыніц будзе забясьпечвацца «Прыбалтыцкі ваенны саюз».

5) На аснове ўсяго сказанага, мы абавязаны быць надзвычайна пільнымі і ўважна сачыць за ўсімі момантамі міжнароднай абстаноўкі, якая зараз складаецца. Яна стала, бясспорна, напружанай. Нашы ворагі гуляюць з агнём. Нам трэба быць у поўным узбраеньні і напагатове. Чырвоная армія павінна быць гатова ў кожную мінуту даць руйнуючы адпор усялякім спробам і вылазкам нашых ворагаў, якія зьбіраюцца правесьці новую інтэрвэнцыю.

Нашы чарговыя задачы

Уся злучаньць міжнародная абстаноўкі яшчэ раз дыктуе нам аб тым, каб мы з усёй адказнасьцю і рашучасьцю ўзяліся за ўзмацненьне баявой падрыхтоўкі нашых чырвоных палкоў і вялі работу так, каб кожная гадзіна, кожная мінута, адведзеная на справу баявой падрыхтоўкі, была-б сапраўды скарыстана з належным посьпехам і максымальнай прадукцыйнасьцю.

Нема патрэбнасьці зноў паўтараць ня раз ужо напісанае і сказанае аб асноўных задачах баявой падрыхтоўкі, пастаўленых нам дырэктывам народнага камісара па вайсковых і морскіх справах на бягучы 1929-30 г. Усе ўжо добра ведаюць гэтыя ўстаноўкі і павінны быць спачатку навучальнага году канкрэтна ня сьпачуць для сваёй часьці асноўны курс і галоўнейшыя задачы падрыхтоўкі. Узяць гэтыя адпраўныя даныя, ляг стрыжань усёй сваёй работы, спланаваць гэту задачу ў час, забясьпечыць яе необходнымі арганізацыйнымі мерапрыемствамі і матар'яльнымі сродкамі, выяснець і ўстанавіць мэтодыку работы і цьвёрда праводзіць тактаваю, падпадраўкуючы ў працэсе не выкананьня тым асноўным і галоўнейшым задачам усё іншае, другарадное. Здаецца, што такое разумачэньне было-б лішнім даваць, калі-б для гэтага ня было даволі сур'ёзных матываў. Наадварот, у нас ёсьць факты, якія кажуць за тое, што ёсьць яшчэ такія куткі, для якіх паданы намі вышэй планавы разьлік работы будзе нельмі карысным для таго, каб кожны, прачытаўшы гэтыя радкі, яверыў і спытаўся ў сябе—ці так сапраўды ён прадстаўляў сабе ў меркаваньнях і вядзе ў даны момант на практыцы сваю работу? Калі будзе вылулена розьніца, ці, вышэй чаканьняў, магчыма наогул адсутнасьць такога плянавага разьліку, то выпраўніць справу лёгка і абавязкова гэта трэба арабіць.

У практыцы нашай работы было рад выпадкаў, калі ня толькі аддзельныя асобы пачскладу, але і асобныя зьвяньні партпалітгрупаў у агульным ходзе бягучага жыцьця не правялі з необходнай выразнасьцю пастановы РВС СССР ад 30 студзеня аб удзеле Чырвонай арміі ў калгасным будаўніцтве краіны і дапусьцілі перагіб у той бок, што непасрэдныя пытаньні баявой падрыхтоўкі падпарадкавалі задачам, таксама, зразумела, важнага значэньня, але якія не зьяўляюцца асноўнымі для Чырвонай арміі, рабоце ў вёсцы па перабудове сельскай гаспаларкі.

Такога прыніжэньня або адціраньня задач баявой падрыхтоўкі на другі плян дапушчаць нельга за поўнай адказнасьцю асоб пачскладу, паліторгана ў і партарганізацый.

Найменшае парушэньне гэтага асноўнага палажэньня зьявіцца простым адхіленьнем ад дырэктывы РВС СССР.

Па ўсіх каналах нашае работы павінны быць прыкладзаены асноўныя намаганьні і аппізарнейшая энэргія для справы ўдасканаленьня баявой падрыхтоўкі нашых чэсьцей.

Ва ўмовах сучаснай міжнароднай абстаноўкі на выкананьне гэтых задач павінна быць прыцягнута ўзмоцненая ўвага ўсяго складу арміі.

Адначасова з адказным выкананьнем сваёй праграмнай работы, вам необходна для дапамогі ўмацаваньню баявой магутнасьці войск разгарнуць на ўсю шырыню і фактычна правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыемствы грамадзка-палітычнага парадку:

а) Мабілізаваць грамадзкую думку як партарганізацый, паліторганаў, так і шырокіх чырвонаармейскіх мас пачскладу і ваенкораў вакол асноўных пытаньняў баявой падрыхтоўкі.

б) Ударніцтвам, як вядучай формай сацспаборніцтва, фактычна ахапіць усе падразьдзяленьні і часьці.

в) На базе разгорнутай самакрытыкі папярэдзваць, выкрываць і ліквідаваць усе хваравітыя зьявішчы, выстаўляючы адначасова для заахвочаньня лепшыя ўзоры работы.

г) Арганізаваць у шырокім маштабе ўзаемнае наведваньне часьцей, як практыку абмену дасягненьнямі.

д) Правесьці акруговы зьлёт ударнікаў і ваенкораў для агульнага агляду дасягненьняў і недахопаў у пастаноўцы работы на сацспаборніцтве часьцей акругі.

Улічваючы нарастаючую небясьпеку вайны, мы на ўсіх зьвеньнях нашай работы павінны выразна і адказна памяць адно—вышэй баявую падрыхтоўку.

Няхай жыве арганізатар, кіраўнік і правадыр пралетарскай рэвалюцыі — УсеКП(б)!

Няхай жыве нязломная апора і магутняя сіла, якая ахоўвае нашае сацыялістычнае будаўніцтва—наша адважная і непераможная Чырвоная армія!

18 лютага 1930 г. гор Смаленск.

«Рэвваенсавету Рэспублікі.

Рэвваенсавет Паўднёвага фронту на сваім пасяджэньні ад 11-га лістапада бягучага году, выходзячы з умоў даная абстаноўкі пастанавіў стварыць конную армію ў складзе 1 і 11 конных карпусоў і адной стралковай брыгады (у выніку злаіць і другую брыгаду).

Склад Рэвваенсавету конной арміі: Камандарм т. Будзённы і члены т. т. Варашылаў і Шадэнка.

Справка Пастановы Рэвваенсавету Паўднёва а фронту ад 11-га лістапада 1919 г. № 505-а.

Азначанае просім апублікаваць.

Пад ударамі чырвонае коньніцы палі Таганрог, Растоў.

У лютым 1920 г., прарваўшыся ў глыбокі тыл, 1-я конная вядзе рашаючыя баі пад Батайскам, Егарлыцкай і Белай Гліны, зьнішчаючы белыя карпусы Паўлава і Кржыжаноўскага.

У баёх з панскай Польшчай, у маі 1920 году, конармія ў складзе 4-х дывізій 4-й, 6-й, 11-й і 14-й кавдывізіі прарывае фронт працоўніка і маланкавым ударам захапляе Бэрдычаў, Жытомір і выходзіць на Львоўскі напрамак.

У жніўні, ідучы на дапамогу заходняму фронту, конармія, ня гледзячы на тое, што яе акружыў вораг, прарывае яго кольца і выходзіць на злучэньне з часьцямі Чырвонае арміі.

Кінутая на Урангелеўскі фронт, конармія папаўняецца маскоўскімі рабочымі, прысланымі маскоўскімі прафсаюзамі, і, зьявіўшыся нечакана на фронце, нанесла Урангелеўскім войскам руйнуючы ўдар.

Калі гэраічным наступленьнем чырвоных пяхотных часьцей узмоцненыя пазыцыі Перакопу былі пасьля крывавых літых баёў узяты, конная армія на плячох адступаючых урангелеўцаў уварвалася ў Крым і дакончыла разгром белай гвардзіі, выкінуўшы гэтую гніліну ў воду Чорнага мора.

На сваім слаўным шляху Конная армія была магутным таранам рэвалюцыі, ствараючы ў самыя крытычныя моманты для рэспублікі пераможны пералом.

Гэта было дасягнута таму, што менавае партыйнае кіраўніцтва забясьпечвала цьвёрдую ўстойлівасьць радоў Конной арміі ў рашаючыя мінуты.

М. М.

У дзень X гадавіны І-й коннай арміі — старым байцом, гэроям і кіраўніком яе нашае палкае прывітаньне!

Індустрыялізацыя, калектывізацыя і Чырвоная армія

«Рэвалюцыі прыдзецца а сучаснымі ваеннымі сродкамі і з сучаснай ваеннай тэхнікай змагацца супроць сучасных ваенных сродкаў і сучаснае ваеннае тэхнікі».

Гэты выразны тэзіс Энгельса яшчэ ў цяперашні час прадстаўляе аснову ваеннай палітыкі пераможнага пралетарыяту.

Супроць масавых рухомых армій з нязвычайным — матар'яльным тэхнічным размахам, супроць бяруцінная шалёнай гонкі ўзбраеньняў, супроць новых сродкаў прыдушэньня — мы ў пабудове Чырвонай арміі павінны «спалучыць энтузіязм новай рэвалюцыйнай клясы з найбольш перадавой тэхнікай сучаснага мілітарызму» (Ленін).

Яшчэ зусім нядаўна, 4-5 год назад, у годы вялікай ваеннай рэформы, Чырвоная армія ў тэхнічных адносінах заставалася амаль на старой базе: «Сабраць усю рашту матар'ялаў, падлічыць іх і сканцэнтраваць на ваенных складах, падрэдае, зрабіць якасны аналіз гэтае масасьці і вызначыць месца кожнага прадмету ў агульнай сыстэме ўзбраеньня» — такавы былі скромныя тэхнічныя задачы, адзначаныя т. Варашылавым у дакладзе IV зьезду саветаў.

Рашучыя зрухі ў тэхнічнай базе краіны, вялікі размах індустрыялізацыі дазваляюць ужо ў цяперашні час нашаму ставіць праблемы тэхнічнага росту Чырвонай арміі. Рашучы рост энэргетычнай базы, посьпехі ў розных важнейшых галінах цяжкой індустрыі, вялізарныя зрухі па выпраўленай пяцігодцы ў аўтамабілі і трактарабудаўніцтве — павінны знайсьці і ўжо знаходзяць сваё адлюстраваньне ў тэхнічным забесьпячэньні вайсковых часьцей Чырвонай арміі.

Нават пры самых грубых падліках, утрунтаваных на практыцы сусьветнай вайны, мы павінны памятаць, што бліжэйшыя гады павінны стаць пераломнымі ў справе пераўзбраеньня Чырвонай арміі, яе матарызацыі і мэханізацыі, у справе ўзьняцьця ваеннай тэхнікі на базу ўзрослых прадукцыйных сіл.

«Прадпасылкай кожнага новага ўдасканаленьня ў вядзеньні вайны павінны быць новыя прадукцыйныя сілы» (Энгельс). Рост прадукцыйных сіл да апошніх год вызначаў сабой нарастаньне тэхнікі ў арміі. Адбываўся яшчэ працэс накаленьня канструктарскае практыкі, выпрацоўкі новых узораў. Зараз 12-ую гадавіну Чырвоная армія сустракае на буйным пераваде, у якім тэхнічныя праблемы маюць важнейшае значэньне.

Нам ня трэба захапляцца тэхнічнай рамантыкай, але ўсе даступныя тэхнічныя сродкі павінны ў самыя кароткія тэрміны зрабіцца ўласнасьцю вайсковых часьцей.

У сувязі з тэхнічным ростам рашуча павышаюцца патрабаваньні да ваеннай падрыхтаванасьці асноўных надраў камандзнага і палітычнага складу арміі. ПУ 29 па сваіх нормах і заданьнях ў значнай меры перахапіў тактычныя формы, заснаваныя на новай тэхнічнай базе. Дзеля таго, каб не адстаць у гэтым важнейшым зьвяне нашай работы, неабходна на кожным занятку, вайсковай гульні, палявой паездцы правяраць уменьне скарыстаць любым агульнавайсковым камандзірам усіх сродкаў сучаснай тэхнікі (танкі, авіяцыя, бронямашыны, матарызаваныя часьці пяхоты і артылерыі, інжынэрныя і хэмічныя сродкі, радыё і г. д.).

Дырэктывы Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету выразна вызначаюць задачы начальніцкага складу Чырвонай арміі ў гэтым пытаньні. Справа за добрасумленным і хуткім выкананьнем паказаных дырэктыў. Усякае замарудзваньне можа нямінуча прывесьці да адсталасьці, да разрыву, да неразуменьня асноўных задач, што стаяць перад Чырвонай арміяй.

Тэзіс Энгельса аб барацьбе «сучаснымі ваеннымі сродкамі» і палажэньне Леніна аб спалучэньні энтузіязму «з найбольш перадавой тэхнікай сучаснага мілітарызму» ні ў якай меры не супярэчыць таму палажэньню, што пралетарская рэвалюцыя ў ваенным абсягу нараджае новыя тыпы і формы будаўніцтва ўзброеных сіл.

Чырвоная армія спалучае з перадавой тэхнікай клясавы характар, кіраўнічую ролю камуністычнай партыі, пралетарскую дысцыпліну і інтэрнацыянальны характар узброеных сіл.

Чырвоная армія ў сваім зародку зьяўлялася пралетарскай міліцыяй. У годы грамадзянскай вайны, а потым у абстаноўцы капіталістычнага акружэньня, на ўмовах узрастаючай пагрозы новых нападаў, Чырвоная армія праз добраахвотніцтва, праз партызанскія атрады перайшла да сваіх сучасных форм, утрунтаваных на спалучэньні пастаяннай арміі з тэрытарыяльнымі фармаваньнямі.

Большая палова Чырвонай арміі ўжо да цяперашняга часу пабудавана на асновах клясавай міліцыі. Тэрытарыяльныя часьці Чырвонай арміі складаюць адно з важнейшых зьвеньняў нашай вайсковай сыстэмы. Іменна гэтыя фармаваньні дазваляюць процінастаўіць імпэрыялістычным узброеным сілам злучаныя намаганьні кваліфікаванай пастаяннай арміі і найшырэйшых мас рабочых і сялян, навучаных кароткімі тэрмінамі службы без доўгага адрыву ад вытворчасьці.

«Патрабаваць ад дыктатуры пралетарыяту ў абстаноўцы капіталістычнага акружэньня неадкладнага і поўнага пераходу да міліцыйнай сыстэмы ёсьць дробна - буржуазная і контр-рэвалюцыйная недарэчнасьць. Больш або менш поўнае ажыцьцяўленьне міліцыйнага прынцыпу ў яго чыстым выглядзе, без паслабленьня ваеннай магутнасьці, будзе магчыма толькі на аснове поўнага разгортваньня прадукцыйных сіл пры сацыялізме ў камуністычным выхаваньні мас» (з тэзісаў VI кангрэсу Камінтэрну).

Гэтыя пастановы выразна вызначаюць далейшыя шляхі будаўніцтва Чырвонай арміі.

Мы ў цяперашні час перажываем рашучыя зрухі ў сельскай гаспадарцы. Шырокая хваля калектывізацыі перавысіла вызначаныя пляны і веснавая пасеўная кампанія рашуча зьмяняе твар нашай вёскі. Ліквідацыя кулацтва, як класы эксплёататараў, націск на прыватны сэктар у горадзе, стварэньне раёнаў, акруг і абласьцей суцэльнай калектывізацыі — усё гэта стварае новыя ўмовы вайсковай работы, якія Чырвоная армія павінна скарыстаць у поўнай мерэ.

Ня столькі ў бок пашырэньня, колькі ў бок паглыбленьня тэрсыстэмы павінна быць скіравана наша ўвага. Мы і да цяперашняга моманту невыстарчальна ахапляем і па колькасьці і па якасьці нашы прызыўныя кантынгэнты. Няўхільнасьць масавых армій патрабуе масавых, добра падрыхтаваных рэзэрвоў нашай вёскі. Ліквідацыя кулацтва, як класы эксплёататараў, націск на прыватны сэктар у горадзе, стварэньне раёнаў, акруг і абласьцей суцэльнай калектывізацыі — усё гэта стварае новыя ўмовы вайсковай работы, якія Чырвоная армія павінна скарыстаць у поўнай мерэ.

Ня столькі ў бок пашырэньня, колькі ў бок паглыбленьня тэрсыстэмы павінна быць скіравана наша ўвага. Мы і да цяперашняга моманту невыстарчальна ахапляем і па колькасьці і па якасьці нашы прызыўныя кантынгэнты. Няўхільнасьць масавых армій патрабуе масавых, добра падрыхтаваных рэзэрвоў ваў. Клясавыя зрухі, што адбываюцца ў нашай краіне на падставе росту індустрыялізацыі і сацыялістычнай перабудовы вёскі, ставяць і новыя задачы.

Мы да гэтага часу цэнтральную ўвагу зварачалі на падрыхтоўку арганізатараў калгасаў з радоў Чырвонай арміі. Трэба адначасова больш шырокім тэмпам разгарнуць скарыстаньне саўгасаў і калгасаў, як цэнтраў вайсковай работы на вёсцы. Трэба больш сьмела і хутка вывучаць на практычным вопыце перанясьнене міжзбораваў работы ў саўгасы і калгасы. Пры новым будаўніцтве гарадоў, гігантаў - заводаў, пры плянаваньні раёнаў суцэльнай калектывізацыі — павінны пачэснае месца заняць ваенныя куткі, спартыўныя гарадкі, ціры і месцы для вайсковай вучобы.

Пры арганізаванай працы калгасаў і саўгасаў трэба ў плянавым парадку забясьпечыць досыць часу для работы з пераменьнікамі. Вакол апошніх павінен арганізавацца вайсковы актыў калгасу і саўгасу.

Мы яшчэ да гэтага часу некалькі недаацэньваем ваеннае значэньня сацыялістычнае перабудовы вёскі. Мне здаецца, што зусім пановаму прыдзецца вырашаць такія праблемы, як: вучот вайсковазабавязаных, арганізацыя яўкі пераменьнікаў, каротка - тэрміновыя зборы, мабілізацыйныя пытаньні.

Рашаючай праблемай зьяўляецца зацчаснае асяляньне ў калгасах і саўгасах касьцяка каманднага складу (сярэдняга і асабліва малодшага).

Іменна тут ствараюцца прадпасылкі разгортваньня «абавязковага навучаньня працоўных сялян ва ўмовах блізкіх да іх штодзённай працы» (з пастаноў VIII зьезду УсеКП(б). Якраз такія-ж умовы паглыбленьня нашай тэрсыстэмы ствараюцца і ў новых індустрыяльных гарадох, дзе будуць з кожным годам скапляцца ўсё большыя масы вытворчага пралетарыяту.

Зьезд Асоавіяхіму, які адбыўся, паставіў у цэнтры сваёй увагі зьмену характару сваёй работы на вёсцы, паколькі дзеля гэтага ствараецца сырыўчая пэрспэктыва і зусім новыя ўмовы. Ужо зараз у радзе калгасаў заўважваецца ажыўленая зацікаўленасьць да ваеннае спрацы.

Трэба арганізацыйна замацаваць і матар'яльна забясьпечыць гэтае важнейшае зьвяно работы Асоавіяхіму.

Зьмена вытворчай базы, стварэньне новых вытворчых адносін, зьмена характару чалавечага матар'яльна зьмяняюць і арганізацыю арміі і ваенную сыстэму і характар самога вядзеньня вайны.

«Новая ваенная навука павінна быць у такой-жа ступені неабходным прадуктам новых грамадзкіх адносін, як створаная рэвалюцыяй і Напалеонам прадстаўляла вынік даных рэвалюцыйных умоў» (Энгельс).

К канцу пяцігодзьдзя мы бязумоўна будзем мець рашучыя зьмены ў самым характары вытворчых адносін у краіне, у якой будуецца сацыялізм. Гэта адкрывае новыя пэрспэктывы будаўніцтва ўзброеных сіл.

Цэнтр нашае ўвагі павінен паранейшаму знаходзіцца ў пытаньнях паляпшэньня якасьці баявога і палітычнага выхаваньня як саміх сябе, так і чырвонаармейскай масы.

Аднак, мы павінны задумвацца і над сваім заўтрашнім днём, дакладна вывучаючы эканамічныя і палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне.

В. С.

Чырвонаармейцы у аграпаходзе: рамантуюць плугі, калесы...

Учора і сёньня

З цягніком АДУЧА

Па доўгіх, цёмных тунэлях перапаўзае праз Урал «тылавы ваенна-санітарны цягнік № 74», цягнік балюў Далёка-Ўсходняй арміі. Шостую тысячу кілёмэтраў адбівае ён бясконцым ланцугом сваіх восей. Мароз лютуе.

Але ў вагоне цёпла, сьветла і холад ня страшны для чырвонаармейцаў, камандзіраў, палітработнікаў, чырвонафлётцаў, якія едуць у Маскву, а адтуль на курорты, у санаторы, дамы адпачынку.

Учора—50-градусныя марозы і сьцюдзёныя провеі Манчжурскіх сопак, а заўтра — адпачынак, спакой і цяпленьне ў прыярыскай марозьлівасьці падмаскоўных санатораў. У таючай цяплині паўднёвага крымскага зямляніках, жудасныя мінуты пад ураганным куляметным і артылерыйскім агнём кітайскіх бандытаў, а сёньня—трыумфальны паход з Чыты у Маскву, нябывалыя на ўрачыстасьці і прыхільнасьці спатканьні на ўсіх станцыях бясконцага сібірскага шляху.

* *

«Марудна сьпяшаецца» цягнік. Паводле нейчай фантазіі фармавалі яго з вялікае колькасьці вагонаў. Паравоз стогне пад надмерным цяжарам. Але і пры не пад надмерным цяжарам ён ня ў іншых умовах не пасьпяшаецца тут! У кожнай станцыі—урачыстая сустрэча. Ня толькі ўдзень, але і ўночы цягнік сустракаюць нават на глухіх станцыях з факеламі, музыкай, цярачымі прывітальнымі прамовамі, увагаю, безліччу падарункаў. Трэба бачыць, як пажылая сялянка заходзіць у вагон, з любасьцю гладзіць сонная чырвонаармейца, ухугвае яго ў коўдру. Трэба чуць, як група праезджых сялян з захапленьнем гаворыць пераходзячым байцом-дадёкаусходнікам: «слова глядзець на вас, дарагія таварышы», каб зразумець, той волгук, які спаткала гэраічная Далёка-Ўсходняя армія і яе перамогі ў сэрцах працоўных нашай савецкай краіны.

* *

«Скажэце, таварыш, чаму вы ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сьцягу?»

— Ды што я, я тут ні прычым. Я адзін чалавек, а нас шмат.

Так адказнае малодшы камандзір і пачынае расказваць не аб сабе, ён аб сваім асабістым гэраічным учынку, а аб тым энтузіязьме і ўздыме, з якім змагаўся яго разьдзел, аб тым масавым гэраізьме, які правяла яго часьць у баі. Ня думаюць, што асоба тут адмерла, што яна не праявіла сябе. Вы можаце пачуць на кожным кроку прыклады яскравага гэраізму і мужнасьці. Вы можаце даведацца, як група чырвонаармейцаў-артылерыстых адстала са сваёй гарматай, бо кані непадкутыя, не маглі ваўзць гарматы па лёдзе. І вось чырвонаармейцы ўзвальваюць на свае плечы голавы коняй і цягнуць іх разам з гарматай на блыскучым, як шкло, лёдзе Аргуні.

Вы можаце даведацца, як два чырвонаармейцы, убачыўшы, што варожая часьць гатова ўцякаць, але застаецца ў акопах пад руляй мазэра, якім награжае расійскі белагвардзеец-палкоўнік, кідаецца на верную сьмерць супроць гэтага палкоўніка, з тым, каб суседзі-таварышы маглі палкоўніка забіць і гэтым зламаць супраціўленьне ворага. Вы можаце пачуць гэраічныя расказы аб тым, як № кавалерыйская часьць кінулася на ворага, які перавышаў яе колькасьцю ў некалькі раз, і зьнішчае яго; як невялікая пагранічная застава стрымлівала напіск і адбівала з вялікімі стратамі ворага, які перавышаў яе ў шмат раз.

* *

Сёньня ў цягніку гэтыя байцы зьяўляюцца зьвеньнямі вялікай змычкі паміж краінай і арміяй, але і ўчора на полі бойкі яны адчувалі сваю непарыўную сувязь з тэй клясай, якая нарадзіла і стварыла Чырвоную армію, яны давалі адчуваць гэтую сувязь ящуканым салдатам бела-кітайскай арміі.

Хіба толькі цяпер на станцыях гутарка ідзе аб пяцігодцы, аб калектывізацыі? Хіба толькі цяпер чырвонаармеец, які выступае з адказам на прывітаньне, заклікае выканаць пяцігодку за чатыры гады?

І там, на сопках Манчжурыі, чырвонаармейцы ішлі ў бой пад лёзунгамі пяцігодкі. І там камуністы, пад агнём варожых куль, кідаўся ўперад і крычаў: «За пяцігодку, таварышы!»

Хіба-ж толькі цяпер выступаюць рабочыя і гавораць аб шэфстве над Чырвонай арміяй, гавораць аб сваёй блізкасьці да чырвонай казармы. І там, на граніцах Манчжуриі, палонныя кітайцы працягвалі рукі, паказвалі на свае мазалі, заўлялі і прасілі не чапаць іх, бо:

— «Мая лабоцы», «мая лабоцы».

Зразумела, не магло быць і гутаркі аб тым, каб хто-небудзь пакрыўдзіў палонпага. Аб гэтым многа расказвалася і пісалася, але аб адносінах чырвонаармейцаў да палонных, аб іх перараджэньні на нашай тэрыторыі можна было-б напісаць цэлыя тамы.

У адным з занятых намі пагранічных гарадкоў дэлегацыя кітайскіх рабочых зьявілася ў штаб палка і заявіла, што прымае над ім шэфства, хаця яна і ведала, што горад заняты ў адказ на вылазку кітайскіх бандытаў і што ён будзе вызвалены, як толькі будзе зруйнавана бела-бандыцкае гняздо...

* *

На адпачынак едуць байцы АДУЧА. Гэтыя байцы варты слаўнага імя Далёка-Ўсходняй. Яны высока трымаюць сьцяг тэй чырвонаштандарнай арміі, якая выканала свой абавязак на манчжурскіх межах. Яны едуць ня толькі для таго, каб адпачываць, а для таго, каб умацаваць сувязі паміж Чырвонай арміяй і рабочай клясай, для таго, каб расказаць, як змагалася з бела-кітайскімі бандытамі Далёка-Ўсходняя армія. І ўспаміны аб слаўным учора, аб баявых перамогах ні на хвіліну не заслоняюць перад імі тых задач, якія стаяць перад імі сёньня, якія могуць стаць, папаўна стануць заўтра:

Быць гатовым да бою. Даваць руйнуючы адпор ворагу.

І. ЛЕМІН.

У 1930 годзе Чырвоная армія дасьць вёсцы

25.000 арганізатараў калгасаў,
20.000 трактарыстых і шофэраў,
45.000 тэхнікаў і іншых спэцыялістых,
10.000 культурных работнікаў.

У раёнах суцэльнай калектывізацыі ўсе пераменьнікі ўвойдуць у калгасы.

Пяцігодка і абарона краю

«Пятилетний план народного хозяйства должен исходить из неизбежности вооруженного нападения на СССР».

(З прамовы тав. Варашылава).

Пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі і паварот ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы, значна завастрылі супярэчнасьці паміж Савецкім Саюзам і капіталістычным сьветам і выклікаюць шалёную падрыхтоўку вайны супроць СССР

Таму наша задача, пакуль няма непасрэднай небясьпекі вайны, павінна заключацца ў тым, каб найбольш поўна выкарыстаць кожны дзень мірнае перадышкі для ўзмацненьня нашай абароны, для разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Будучая вайна характарызуецца як вайна «мэханізаваная», вайна, «у часе якой будуць выкарыстаны вялізарныя колькасьці матар'яльных рэсурсаў».

На XV партзьезьдзе тав. Варашылаў заявіў, што «Баяздольныя, узброеныя сілы зьяўляюцца толькі адным з многіх фактараў, якія вызначаюць абароназдольнасьць дзяржавы».

Інтарэсы абароны краю патрабуюць хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі і росту цяжкай індустрыі, хэмічнай прамысловасьці, пабудовы аўтамабільных і трактарных заводаў — усё гэта падводзіць магутную эканамічную базу пад умацаваньне абароназдольнасьці краю.

Такім чынам, пяцігодка будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі тым самым ужо зьяўляецца «пяцігодкай абароны» СССР ад нападзеньня клясавых ворагаў.

У бягучым гаспадарчым годзе калектывізацыя сельскай гаспадаркі дасягне вялікіх посьпехаў. Ужо ў гэтым годзе мяркуецца атрымаць палавіну таварнага хлеба ад аграмаджанага сэктару.

Да канца пяцігодкі, трэба думаць, мы будзем мець новы твар калектывізаванай вёскі. Перабудова сельскай гаспасырцоцую базу ў выпадку будучай вайдаркі пановаму вырашае спажывецкана. Калектывізацыя вёскі стварае новыя ўмовы вайсковай работы ў вёсцы і дае магчымасьць далейшага паглыбленьня тэрытарыяльнае сыстэмы

Вялікае значэньне для абароны краю будуць мець клясавыя зрухі, якія адбудуцца ў Савецкім краі, у выніку росту сацыялістычнай прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Удзельная вага пралетарыяту ў краі — палымецца. Калектывізацыя сельскае гаспадаркі дасьць новы тып селяніна-чырвонаармейца, цесна зьвязанага з сацыялістычным будаўніцтвам краю —ён будзе абараняць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну з нябачанай упартасьцю.

У выніку мы будзем мець далейшае ўзмацненьне Чырвонай арміі, як зброі пралетарскай дыктатуры.

Вось чаму лёзунг пераўтварэньня пяцігодкі ў чатырохгодку, паскарэньня індустрыялізацыі, мае вялізнае значэньне для абароны краю і недаацэньваньне гаспадарчых плянаў, якое мы маем за першыя чатыры месяцы бягучага гаспадарчага году (вугаль, жэлязо, хэмія), б'е ня толькі па народнай аспадарцы, але і па абароназдольнасьці нашага краю.

Таму ўдарнай баявой задачай дня зьяўляецца ўздым новай хвалі рабочай ініцыятывы, актыўнасьці, мабілізацыі мас вакол задачы выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, каб нагнаць упушчанае і абагнаць запраектаваны меркаваньні на бягучы гаспадарчы год.

Рабочая кляса заўсёды адказвала на труднасьці ўдзесяцярэньнем энэргіі. Так было ў гады грамадзянскае вайны, так было ў часе канфлікту на К.-У. чыгунцы, калі ў адказ на правакацыю кітайскай ваеншчыны рабочыя павысілі прадукцыйнасьць працы, зьнізілі прагулы, зьменшылі брак і г. д.

І зараз, перад тварам падыходзячае ваеннае небясьпекі, рабочая кляса таксама павінна ўзмацніць сваю ўнергію, актыўнасьць на вытворчасьці; адказаць новым уздымам вытворчага энтузіязму, арганізацыяй новых і новых тысяч ударных брыгад, забясьпечваючы посьпехі індустрыялізацыі краю, павышэньне баявой магутнасьці ўзброеных сіл пралетарскае дыктатуры.

Чым большыя нашы посьпехі, тым больш пагражае небясьпека імпэрыялістычных войн супроць нас, і недаацэньваць небясьпеку вайны—шкадней за ўсё.

Наша «мірная перадышка» ня вечная і мы павінны быць гатовы кожную мінуту да адпору.

М. ВІЛЬКАБРЫСКІ

Да гісторыі ўтварэньня Чырвонай арміі на Беларусі

Наяўнасьць Заходняга фронту і шматлікіх франтавых арганізацый на тэрыторыі Беларусі рабіла ўмовы ўтварэньня некалькі іншымі, чым у іншых часьцях Савецкага Саюзу.

Чырвоная армія на Беларусі мела сваімі папярэднікамі цэлы рад арганізацый, узьнікшых у старых рамках царскай арміі, якая распалалася.

Лютаўская рэвалюцыя адчыніла магчымасьць адкрытай палітычнай дзейнасьці ў арміі. Але ўтвораныя ў першыя дні палкавыя, дывізійныя, кардусныя і армейскія салдацкія камітэты трапілі ў руку пераважна меншавікоў і эсэраў, а часткова і буржуазнага афіцэрства. Пачаўся пэрыяд упартага змаганьня за палітычны ўплыў на шырокія масы рабочых і сялян, апранутых у салдацкую шынэлю, паміж бальшавікамі і дробна-буржуазнымі партыямі

Вусная і друкаваная агітацыя і прапаганда былі тымі формамі, праз якія ўплывала партыйная арганізацыя бальшавікоў. Вялікую ролю адыграла ў гэтых адносінах газэта «Зьвязда», якая пачала выходзіць 27 ліпеня 1917 году. Баявы орган бальшавікоў павінен быў перамагчы цэлы рад цэнзурных і матарыяльных труднасьцяй. Меншавіцка-эсэраўскія салдацкія камітэты адносіліся да бальшавіцкага друку варожа, перашкаджалі пранікаць у масы. Тым ня менш ён пранікаў вельмі быстра праз галовы камандаваньня і кіруючых арганізацый.

За пэрыяд ліпеня і жніўня ў «Зьвяз

Антысавецкая імпэрыялістычная установа ў Вільні

У свой час савецкая прэса данасіла, што фашысцкі ўрад Польшчы намерваецца стварыць у Вільні «Навукова-дасьледчы інстытут Усходняй Эўропы». Не без падстаў, мы ўказвалі, што стварэньне падобнага інстытуту носіць яўна антысавецкі, імпэрыялістычны і ваенны характар.

Польскі афіцыёз — орган пілсудчыкаў «Газэта Польска» ад 21 лютага даносіць, што 23 ЛЮТАГА ў Вільні будзе ўрачыста адкрыты гэты інстытут. На ўрачыстасьці прыняджае ў Вільню міністар унутраных спраў Юзэфскі, вядомы сваімі выступленьнямі, скіраванымі супроць Савецкай Украіны, былы міністар у патлюраўскім контр-рэвалюцыйным урадзе. Уваходжаньне Юзэфскага ва ўрад Бартэля было яркім антысавецкім крокам і яшчэ раз адкрыта падкрэсьліла антысавецкі, ваенны характар гэтага, як і папярэдняга, ўраду. На ўрачыстасьці мяркуецца нават прыезд міністра замежных спраў Залескага.

Гэтая-ж газэта гаворыць аб мэтах стваракмага «інстытуту Ўсходняй Эўропы». Газэта піша: «НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ УСХОДНЯЙ ЭЎРОПЫ МАЕ СВАЁЙ МЭТАЙ ВЫВУЧЭНЬНЕ ТЭРЫТОРЫЯЎ, НАРОДАЎ І ДЗЯРЖАЎНЫХ СЫСТЭМ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА ПАМІЖ ЧОРНЫМ І БАЛТЫЦКІМ МОРАМІ». Такім чынам, зноў на старонках афіцыйнай фашысцкай прэсы паяўляецца старая і заўсёды новая імпэрыялістычная ідэя пілсудчыкаў аб стварэньні вялікае польскае буржуазнае дзяржавы «ад мора да мора», у гэтым выпадку, пад плашчыкам стварэньня «навукова-дасьледчага інстытуту». Мы маем тут ні што іншае, як, папершае — прадаўжэньне ўзмоцненай падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу, узмацненьне імпэрыялістычнай экспансіі ў бок савецкай краіны і падругое — працягваньне актыўнай працы ў справе стварэньня і ўзмацненьня антысавецкага блёку прыбалтыцкіх дзяржаў.

Урачыстасьці, якія будуць сёньня адбывацца ў Вільні, ды яшчэ зьвязаныя з адкрыцьцем антысавецкае, імпэрыялістычнае ўстановы, ва ўмовах абвостранай антысавецкай траўлі набываюць асаблівае значэньне. Фактычна ў Вільні будзе адбывацца адна з праяў адкрытага антысавецкага выступленьня. Што стваракмы ў Вільні «інстытут» носіць яўна антысавецкі характар і што заявы аб яго гэаграфічных маштабах працы («ад Чорнага да Прыбалтыцкага мора») выяўляюць імпэрыялістычнае аблічча тварцоў гэтага «інстытуту», гаворыць выключны па сваёй адкрытасьці артыкул аб апошнім прыезьдзе Штрандмана ў Польшчу, артыкул, зьмешчаны ў пілсудчыкоўска-манархічнай газэце «Слова» ў той самы дзень, у які даносіць «Газэта Польска» аб адкрыцьці «інстытуту».

Падсоўваючы прыбалтыцкім дзяржавам думку аб тым, што СССР зьяўляецца іх самым вялікім ворагам, віленскае «Слова» піша: «Ніхто, як толькі Польшча, ня мае столькі шансаў да таго, каб адыграць кіруючую ролю над Балтыкай, але дзеля таго, каб гэтая роля была больш поўнай, патрэбна поўная згода, паяўючая паміж гэтымі дзяржавамі» (прыбалтыцкімі дзяржавамі).

Газэта з усёй адкрытасьцю іменна падкрэсьлівае, што прыезд у Польшчу прэзыдэнта Штрандмана і служыў мэце ўзмацненьня гэтай «згоды» прыбалтыцкіх дзяржаў. Цяпер газэта зварочваецца з асобным заклікам да Латвіі, каб і яна ясна і пэўна заняла-б «пачэснае» месца ў радох антысавецкага блёку. Газэта, якая не хаваецца за мішуру дыплёматычнай іўжы, проста заяўляе: «Даўно ўжо пара, каб ня толькі Латвія, але ўсе балтыцкія дзяржавы адзіна і салідарна задэкляравалі свае пазыцыі і ясна заявілі тое, што праходзіць чырвонаю ніткаю ў іх палітычных арыентацыях абуслоўленых нясупынкай небясьпекай, якая пагражае ім з боку Савецкай Расіі».

Прэса Савецкага Саюзу, такім чынам, не памылялася, калі яна ацаніла паездку эстонскага прэзыдэнта Штрандмана ў Польшчу, як ярка антысавецкі крок. Сёньня гэта выбалтывае віленскае «Слова». Супаданьне гэтай адкрытай балбатні віленскіх манархістаў з урачыстым адкрыцьцем «навукова-дасьледчага інстытуту» невыпадкова. І тое і другое, у агульнай сувязі з завастрэньнем антысавецкага цкаваньня, выступае як зьвяньні аднаго і таго-ж ланцугу.

Працоўныя БССР будуць уважліва сачыць за кожным рухам фашысцкага суседа. Працоўныя з вялікай увагай будуць сачыць за тымі «ўрачыстасьцямі», якія адбудуцца ў Вільні ў сувязі з адкрыцьцем імпэрыялістычнага «інстытуту».

Сёньня працоўныя масы Савецкага Саюзу будуць дэманстраваць сваю ГАТОЎНАСЬЦЬ, РАЗАМ СА СВАЁЙ ГЭРАІЧНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ АБАРАНЯЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ КРАІНУ АД ЯКІХ-БЫ ТО НІ БЫЛО НАПАДАЎ МІЖНАРОДНЫХ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ, У ТЫМ ЛІКУ І ІХ ПОЛЬСКАГА ФАШЫСЦКАГА АТРАДУ. Няхай аб гэтым не забываюць паны генэралы, паны Юзэфскія, няхай аб гэтым цьвёрда памятаюць польскія імпэрыялісты, якія сёньня будуць праводзіць «урачыстасьці» ў сувязі з адкрыцьцем імпэрыялістычнай і антысавецкай «установы» ў Вільні.

Эм.

Абагуленьне жывёлы

Яшчэ нядаўна найбольш пашыраній формай калгасаў было таварыства супольнае апрацоўкі зямлі — прасьцейшае аб'яднаньне, у якім абагульвалася праца, але захоўвалася прыватная ўласнасьць на сродкі вытворчасьці. Цяпер значная частка ТСАЗ стыхійна пераводзіцца на статут с.-г. арцелі, у якой калектывізуюцца ўжо ня толькі праца, але і асноўныя сродкі вытворчасьці — мёртвы і жывы інвэнтар, гаспадарчыя пабудовы, таварна - прадукцыйная жывёла. Іменна гэты пералік асноўных сродкаў вытворчасьці, якія належаць да абагуленьня ў с.-г. арцелі, зазначаны ў пастанове ЦК «Аб тэмпе калектывізацыі».

Ня гледзячы на выразнасьць гэтае ўстаноўкі, на мясцох пры правядзеньні калектывізацыі сродкаў вытворчасьці і ў прыватнасьці пры абагуленьні жывёлы дапускаецца самавольнае і часта памылковае вызначэньне аб'ектаў, якія належаць абагуленьню. У прыкладным статуце с.-г. арцелі, які ўхвалены НКЗ СССР і Калгаспэнтрам, ясна зазначаецца, што абагуленьню належыць толькі рабочая і таварна - прадукцыйная жывёла. Між тым, у радзе месц наглядаецца тэндэнцыя абагульваць ня толькі таварна - прадукцыйную жывёлу, але і жывёлу, прадукцыя якой ня носіць таварнага характару.

На Паўночным Каўказе «Крайзу» выпрацавала ўласны статут арцелі, паводле якога да абагуленьня належыць «уся жывёла».

У станіцы Выселкі (Кубань) мясцовы буйны калгас «Октябрь» безадкладна правёў абагуленьне згодна гэтага статуту і калектывізаваў ўсю малочную жывёлу. У Паўлаўскім раёне мясцовыя работнікі да абагуленьня жывёлы падыйшлі з вузка - спажывецкага пункту погляду. Тут вырашана абвясьціць усю малочную жывёлу абагуленай, пакінуць яе на ўтрыманьні ў ранейшых уладальнікаў, лішкі-ж малака адбіраць і разьмяркоўваць па гаспадарках, якія ня маюць кароў.

Дзе-ні-дзе на мясцох ідуць яшчэ далей, робяць абагуленьне авец, сьвіней і нават хатняй птушкі.

Зусім ясна, што падобны характар «абагуленьня» не выцякае з партыйных дырэктыў і зьяўляецца шкодным перагінаньнем. Такое «абагуленьне» прыводзе толькі да памяншэньня прадукцыйнасьці жывёлы бо догляд яе, натуральна, пагоршыцца) і ня толькі ня зробіць абагуленую малочную жывёлу таварна - прадукцыйнай, але і зусім зьнішчыць таварны выхад малака.

Памылкамі і перагінаньнямі, дапушчанымі на мясцох пры абагуленьні жывёлы, карыстаецца кулак у сваёй антыкалгаснай агітацыі. На гэтых-жа памылках заснавана незадаваленьне сялянак, якія лічаць, што калгас абавязкова «адбярэ» ў іх сьвіньню, або карову, хаця-б прадукцыя гэтае каровы не насіла таварнага характару.

Трэба ўнесьці поўную яснасьць у практыку абагуленьня жывёлы. Поўнасьцю абагульваецца толькі рабочая жывёла. Абагульваньне прадукцыйнае жывёлы абумаўляецца задачай павялічэньня таварнае жывёлагадоўлі. Сялянская жывёла, якая ня мае таварна-прадукцыйнага характару, або малочная жывёла, абагульненьне якое ня будзе садзейнічаць павялічэньню таварнасьці, павінна накідацца ў асабістым карыстаньні калгаснікаў.

Спасыланьне на факты драпежніцтва забою жывёлы, для барацьбы з якім і патрэбна моў абагульненьне, у даным выпадку не абгрунтавана. З забоем ужыткоўнае жывёлы трэба змагацца шляхам разгортваньня агітацыйна - масавай работы і, у адасьлівых выпадках, адміністрацыйна - судовымі мерапрыемствамі. («ПРАВДА»).

Стан калектывізацыі ў СССР на 10 лютага

МАСКВА. Паводле даных НКЗ СССР, на 10 лютага калектывізавана па РСФСР, УССР і БССР 10.657.000 гаспадарак, або 45.6 проц. і атрамаджана пахаці 69.188.000 гэктараў. Насенных фондаў у калгасах сабрана ўсяго 43.5 проц. патрэбнай колькасьці. З усяго складу напсаваных трактараў 21.388 да 10 лютага адрамантавана 11.706, або 54.7 проц.

Выпуск „Пяцігодку—у чатыры гады"

ПАСТАНОВА ЦВК І СНК СССР

ЦВК І СНК СССР пастанавілі выпусьціць новую дзяржаўную пазыку пад назвою: «Пяцігодку—у чатыры гады». Гэта пазыка павінна быць адзінаю пазыкаю фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва паводле пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі Саюзу ССР. Яна павінна быць разьмешчана на працягу 1930-31 году і 1931-32 году.

Усе аблігацыі 1-й, 2-й і 3-й дзяржаўных выйгрышных пазык індустрыялізацыі народнае гаспадаркі СССР і дзяржаўнай унутранай выйгрышнай пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі павінны быць абменены на аблігацыі новай пазыкі «Пяцігодку—у чатыры гады». Закончыць абмен аблігацый пазыкі індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на аблігацыі пазыкі «Пяцігодку—у чатыры гады» —да 1-га студзеня 1931 году. Да гэтага тэрміну трымальнікам аблігацый, неабмененых на аблігацыі новай пазыкі, забясьпечваюцца ўсе законы (процанты і выйгрышы), прадугледжаныя законамі аб выпуску гэтых пазык.

Умовы пазыкі «Пяцігодку—у чатыры гады» ўстанаўліваюцца асобнай пастановай ЦВК і Саўнаркому СССР.

Наркамфіну СССР даручаецца весьці работу па падрыхтоўцы гэтай пазыкі з такім разьлікам, каб яна магла быць выпушчана не пазьней 1-га жніўня 1930 году.

У другой пастанове ЦВК і Саўнаркому зазначаецца, што да 1-га студзеня 1931 году па аблігацыях пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі праводзяцца тыражы выйгрышаў і напічэньне процантў, згодна законаў аб выпуску гэтых пазык, з 1-га студзеня 1931 году напічэньне процантаў і тыражы выйгрышаў па аблігацыях пазык, якія павінны быць абменены—спыняюцца.

Тыражы выйгрышаў 1-й, 2-й і 3-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, якія прыпадаюць на час паміж выпускам пазыкі «Пяцігодку—у чатыры гады» і 1-га студзеня 1931 году праводзяцца адначасова з тыражамі выйгрышаў пазыкі «Пяцігодку—у чатыры гады», якія прыпадаюць на той-жа пэрыяд часу.

Аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, неабмененыя да 1-га студзеня 1931 году, прымаюцца па іх намінальным кошце да 1-га студзеня 1934 году ва ўплату за аблігацыі дзяржаўных пазык, сьпіс якіх устанаўляецца Народным Камісарыятам Фінансаў СССР.

Пасьля 1-га студзеня 1934 году аблігацыі пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі анулююцца.

Перавысіўшыя прамфінплян—на 7-гадзінны

МАСКВА, 21. Урадавая камісія па пераводзе прадпрыемстваў на 7-гадзінны рабочы дзень прызнала мэтазгодным пераведсьці ў 1929-30 годзе за 7-гадзінны рабочы дзень ня толькі тыя прадпрыемствы, якія павінны быць пераведзены на пляне, але таксама і прадпрыемствы, якія перавысілі ў паралку сацыялістычнага спаборніцтва прамфінплян за 1929-30 год.

ПРЫВІТАНЬНЕ

Чырвонай арміі ад Фрунзаўскага зьлёту ўдарнікаў

Непераможнай Чырвонай арміі, у дзень яе гадавіны,—палкае ўдарніцкае прывітаньне ад рабочых Фрунзаўскага раёну г. Менску.

Крывёю і магутным напружаньнем усіх нашых сіл мы, пад кайніцтвам Камуністычнай партыі, зьмялі з твару савецкай зямлі контр-рэвалюцыйныя сілы старога сьвету.

Слава гэроям Чырвоных паходаў!

Слава Чырвонай арміі!

Таварышы чырвонаармейцы! Сёньня, у дзень 12-ай гадавіны Чырвонае арміі, трэба з асаблівай выразнасьцю падкрэсьліць неабходнасьць новага ўзброенага нападу капіталістых на Савецкі Саюз бяльпеку новага ўзброенага нападу капіталістых на Савецкі Саюз Сацыялістычных Рэспублік. Небясьпека імпэрыялістычнага нападу ды Савецкі Саюз завастрэнна ростам рэвалюцыйных настроў працочай клясы на Захадзе і пераможнымі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Сусьветны капіталізм, адчуваючы набліжэньне свайго сьмяротнага часу ў ажыцьцяўленьні Савецкім Саюзам пяцігодкі, у посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі,—узмацняе падрыхтоўку нападу на Савецкі Саюз.

Чырвоная армія, якая ў часе апошніх падзей на Далёкім Усходзе паказала сваю клясавую вытрыманасьць і баявую здольнасьць, павінна яшчэ больш узмацніць ахову межаў Савецкага Саюзу—краіны, дзе будуецца сацыялізм.

Мы ўрачыста абяцаем рабоча-сялянскай Чырвонай арміі няўхільна выконваць пяцігодку нашага сацыялістычнага будаўніцтва, мы прыкладзем усе сілы для замацаваньня абароназдольнасьці нашага тылу.

Няхай жыве Чырвоная армія!

Няхай жывуць сталёвыя рады нашага правадыра—Ўсесаюзнай Камуністычнай партыі!

Ударнікі—байцы за прамфінплян

Пасяджэньне канфэрэнцыі ўдарнікаў Фрунзаўскага райкому 23-га лютага было прысьвечана справкам па дакладах т.т. Гея і Грысэвіча. У справках выказалася да 20 рабочых, да 40 чалавек не пасьпелі выказацца.

Рабочы Фішбэйн (галянтарэйная фабрыка) адзначае, што галянтарэйная фабрыка расьце з кожным днём. Месяц назад было 100 рабочых, зараз — 376 чал. Прамфінплян за першы квартал быў выкананы толькі на 49 проц. Такое ганебнае зьявішча падняло на ногі ўсіх рабочых — усю грамадзкасьць заводу, і ў другую дзесяцідзёўку лютага прамфінплян ужо выкананы на ўсе 100 проц.

Ударнікі галянтарэйнай фабрыкі адзначаюць, што з боку БСНГ адсутнічае належнае кіраўніцтва фабрыкай. Ударнікі патрабуюць узмацненьня фабрыкі тэхнічнымі сіламі.

Вялікія спрэчкі разгарнуліся вакол пытаньня аб становішчы заводу «Дрэваапрацоўшчык».

Трэст, заводакіраўніцтва і рабочыя ня ведаюць калькуляцыі сваіх вырабаў. Згодна інфармацыі дырэктара заводу,—кажа рабочы т. Гольштэрм, — у нас заўсёды перавыкананьне прамфінпляну. Тут, на канфэрэнцыі, мы даведаліся аб тым, што этыя лічбы чаверны. Усе нашы дасягненьні зьядаюць вялізарныя накладныя выдаткі, якія складаюць 147 проц. На 300 рабочых у нас 40 служачых, што зьяўляецца зусім недапушчальным. Рад прыкладаў бесгаспадарчасьці падаў рабочы Белдзяржбуду тав. Бэйлін, які разам з ударнай брыгадай правяраў выкананьне прамфінпляну заводу «Дрэваапрацоўшчык».

— На заводзе, — кажа т. Бэйлін, — на вачох усіх рабочых, зусім годны матар'ял, дуб, ідзе на падпал у печку. Ніхто на гэта не рэагуе. Ніхто ня ведае сабекошту прадукцыі. Крэсла, па словах дырэктара, каштуе 5 р. 40 к., па словах бухгальтара — 7 р. 60 к., а рабочы зусім ня ведае сабекошту. На заводзе з кожным днём павялічваецца брак.

Наколькі дрэнна пастаўлена ахова заводу відаць з таго, што гэтымі днямі быў пакрадзены вялізарны матор. Пакрадзены нажы каштоўнасьцю ў некалькі сот руб., штодзенна зьнікаюць інструманты.

Ударнікі Шапавалаў (Домбуд), Лунін (Універсытэцкі гарадок), Сулкоўскі («Камунар»), Нісэнбаум (Хлебазавод) і інш. расказваюць аб дасягненьнях і недахопах работы на прадпрыемствах.

З прамовай выступае сакратар АК тав. Славінскі.

— Мала назваць слабе камуністычным ударным цэхам заводу, трэба ўмець выканаць абавязкі, якія накладае гэтая назва. Вось, завод «Энэргія» абвясьціў сябе камуністычным, — кажа т. Славінскі, — а прамфінплян ня выкананы поўнасьцю. У сталоўку рабочыя ўсё яшчэ бягуць за 5 мінут да гудка, а работы выходзяць раней тэрміну.

На «Дрэваапрацоўшчыку» рабочы ня ведае кошту прадукцыі, якую ён выпускае. Гэта значыць, што рабочы «Дрэваапрацоўшчыка» яшчэ ня стаў гаспадаром фабрыкі. Для таго, каб была гарантыя выкананьня вызначаных задач, кожны рабочы павінен ведаць сваю ролю, свой удзел у сацыялістычным будаўніцтве.

Бурнымі авацыямі канфэрэнцыя спаткала прадстаўніка Чырвонае арміі, камандзіра 6-га палка т. Кольбака. Перадаўшы прывітаньне ад імя Чырвонае арміі, т. Кольбак заклікаў рабочых пасьледваць прыкладу ўдарнай Далёка-Ўсходняй арміі, якая з гонарам выканала свае абавязкі.

ФРАНЦУСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ ДАЕ РАШУЧЫ АДПОР АБНАГЛЕЎШАЙ РЭАКЦЫІ

ПАРЫЖ, 22. Па закліку кампартыі некалькі тысяч парыжскіх рабочых арганізавалі контр-дэманстрацыю пад лёзунгам «Рукі прэч ад Савецкага Саюзу» у адказ на антысавецкі мітынг, наладжаны газэтай «Лібэртэ» разам з рускімі белагвардзейцамі. Увесь раён быў ачэплены паліцыяй, жандармэрыяй і рэспубліканскай гвардыяй. У раёне мітынга фашыстых было сканцэнтравана каля 2.000 паліцэйскіх і жандараў. На мітынг фашысцкія арганізацыі прапускалі толькі асоб, якія прадаўлялі запрашальныя білеты. Сярод недапушчаных на мітынг быў і камдэпутат Дорыё.

Рабочыя, якія зьявіліся на мітынг з прадпрыемстваў і раёнаў групамі, разганяліся паліцыяй. Паліцыя, як заявіла відавочна рэдакцыі «Юманітэ», зьбівала рабочых-дэманстрантаў. Рабочыя энэргічна супраціўляліся і ў радзе выпадкаў вырвалі з рук паліцыі арыштаваных ею удзельнікаў контр-дэманстрацыі. На працягу некалькіх гадзін паліцыя не магла расьсеяць групы дэманстрантаў, якія пасьля разгону ў адным месцы, зноў зьбіраліся ў другім пункце, агалашаючы вуліцу воклічамі: «Няхай жывуць саветы» і пяяньнем «Інтэрнацыянала».

На гледзячы на ўсе прынятыя паліцыяй і арганізатарамі мітынгу меры, ня гледзячы на пільную фільтроўку ўдзельнікаў мітынгу, некалькім сотням рабочых, камуністам удалося прабрацца на фашысцка-белагвардзейскі сход. Воклічамі ў абарону Савецкага Саюзу рабочыя неаднакраць перарывалі выступленьні кіраўнікоў антысавецкай кампаніі. У выніку антысавецкі мітынг некалькі раз перарываўся. Пры дапамозе паліцыі фашысцкія арганізатары мітынга сілаю выдалілі рабочых з залі.

З-за баязьні новых выступленьняў рабочых арганізатары мітынгу абмежаваліся толькі прамовамі з патрабаваньнем разрыву французка-савецкіх адносін і адмовіліся ад дэманстраваньня антысавецкага фільму.

Некалькі дзесяткаў удзельнікаў контрдэманстрацыі арыштаваны. Адначасова а контр-дэманстрацыяй у будынку мітынга групамі рабочых камуністых і камсамольцаў былі арганізаваны дэманстрацыі пад лёзунгамі абароны Савецкага Саюзу.

«Юманітэ» вітае парыжскіх рабочых, якія зноў далі адпуць фашыстым, якія схаваліся за сьпіною паліцыі, волю французкага пралетарыяту да абароны Савецкага Саюзу.

Рабочыя да позьняга вечара ўладалі вуліцай

ПАРЫЖ, 22, 21-га лютага у горадзе Морэ, дзе ўжо больш месяца бастуе 2.500 рабочых ситычнай прамысловасьці, была праведзена алналенная ўсеагульная забастоўка салідарнасьці. Да забастоўкі далучылася пагалоўна ўсё працоўнае насельніцтва гораду ў тым ліку рабочыя дрэваапрацоўшчыкі і нават рамесьнікі. Горад быў перапоўнен паліцыяй і жандармэрыяй. Ня гледзячы на супраціўленьне паліцыі, рабочыя наладзілі пасьля заканчэньня мітынгу грандыёзную дэманстрацыю і да позьняга вечара займалі вуліцу і пялі рэвалюцыйныя песьні, даючы рашучы адпор ня раз нападаўшай жандармэрыі.

Мітынг беспрацоўных у абарону СССР

ГЭЛЬСЫНГФОРС, 20. Сёньня ў Гэльсынгфорсе адбыўся масавы мітынг беспрацоўных. Выступаўшыя на мітынгу прамоўцы супастаўлялі посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР з ростам беспрацоўя ў буржуазных дзяржавах. Мітынг адпагалосна прыняў рэзалюцыю, якая заклікае беспрацоўных да далейшых масавых выступленьняў.

Беспрацоўныя разграмілі канцылярыю бурмістра

ВЕНА, 18. З Атэн паведамляюць, што некалькі сот атэнскіх рабочых, пад кіраўніцтвам камуністых, з воклічамі «Няхай жыве Савецкі Саюз» учора накіраваліся да магістрату, патрабуючы задаваленьня патрабаваньняў беспрацоўных. Уварваўшыся ў канцылярыю бурмістра дэманстранты разграмілі яе.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Чацьвер, 27 лютага
Рачнік для вучняў
АВЕЧАЯ КРЫНІЦА
Пачат. роўна а 12 г. дня
Білеты ў школах
Увечары спэктакль для саюзу саўгандальслуж.
„ДЖЫМ КУПЕРКОП"
Пачатак роўна а 8 гадз. увечары
Білеты ў клюбе саўгандальслуж. і мясцком.

КІНО-ТЭАТР КУЛІЗЫ
Гістарычны мастацкі фільм у 10 частках.
ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА
Паводле вядомага раману Віктара Гюго
Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 30 м., 2-га—8 г. 40 м., 3-га—10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі
Мастацкі фільм
ТРАНСПАРТ АГНЮ
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
кіно-часопісь „Сав. Беларусь" № 2 Белдзяржкіно.
Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз

КІНО Пралетары
Мастацкі фільм вытворчасьці „Межрабпом-фільм"
Злачынства Караваева драма ў 6 частк.
Звыш праграмы: кіно-часопісь Сазкіно № 5.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
2 фільмы ў адзін сэанс
1. Мастацкі фільм ВАЙСКОВЫЯ САБАКІ у 5 частк.
2. Навукова папулярны фільм
Вада і яе энэргія ў 9-ых частк.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 20 м.
Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО Спартак
Выдатны фільм
ПАТОМАК ЧЫНГІС-ХАН
драма ў 8 частках
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: 1-6 г. 30 хв. 2-8 г. 30 м., 3-10 гадз. 30 м.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

БЕЛДЗЯРЖКІНО ДА ДНЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ
СЁНЬНЯ, 23 ЛЮТАГА
2 ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ 2
па ільготных цэнах
АДНАЧАСОВА У ДВУХ КІНО-ТЭАТРАХ
„КУЛЬТУРА" і „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Гістарычна-мастацкі фільм у 10 частках
ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА
Паводле вядомага раману ВІКТАРА ГЮГО
Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз. дня, 2-га—ад 3 гадз. 30 мін.
Касы адчынены ад 12 гадз. дня
Увесь збор пойдзе ў карысьць санаторнага пячэньня байцоў Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".
З 24 лютага
Толькі 6 гастроляй. Толькі 6 гастроляй.
АРТЫСТА ЛЕНІНГРАДЗКІХ ТЭАТРАЎ
Сяргея ВРОНСКАГА
САТЫРА, ГУМАР, РАМАНСЫ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ
Клинический испытанное и химически стандартное чистящее средство против ушных клещей
ПРЕЙСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ
ЦЕНА ФЛАКОНА 2 руб.
во всех аптеках.
При отсутствии высылаем флакон за 1 руб. с пересылкой на тару
Аптекарский кооператив
ГАЛЕН-МОСКВА
МОСКВА 55, 2-ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. 6

ЗАОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ
Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых камэрцыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцелей усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.
Тэрмін навучаньня 6 месяцаў.
Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.
Скорачэньне курсы атрымліваюць адказныя пасьведчаньні.
Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 3 месяці і па 4 руб. штомесячна і па чатыры кожнага навучальнага месяца. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя марк.
Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, бліг. рахунак № 682. Усю карэспанд. накіроўваць: Менск Усекабанк, Заочным курсам.

ПОЛНЫЙ ПЕСЕННИК „БАЯН"
Песни русские старинные плясовые, шуточные, хоровые, девичьи, молодецкие, красноармейские, флотские, революцион., бытовые, разные частушки и мн. др.
Цена с пересылкой 1 р. 60 коп.
высылает кооперативн. т-во „Культура и Знание" Москва, Политехн. музей, 110.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ".
Ад нядзелі, 23 лютага
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ. ВЫТВОРЧАСЬЦІ „МЕЖРАБПОМ-ФІЛЬМ".
Паводле фэльетону А. ЗОРЫЧА
ЗЛАЧЫНСТВА КАРАВАЕВА
ДРАМА Ў 6 ЧАСТКАХ.
Рэжысэр—Т. ЛУНАШЭВІЧ. Аператар—С. ЖЕВЖРЫКІН. Мастак—Е. КАЗЛОЎСКІ.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
Вылучэнец—А. І. ГРОМАЎ. Прыватнік—В. Н. ШТЭЙН. Яго жонка—О. В. КАЛІВЭР.
Нам. старш. трэсту—В. НАГРАДАЎ. Сакратар—Г. ГАЛІНА і інш.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — кіно-часопісь САВКІНО № 5.
Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. КАСА адчынена ад 5 гадз. увеч.

Акц. О-во „ГОСМЕДТОРГПРОМ"
ПОКАЗАН к ПРИМЕНЕНИЮ ПРИ: артериосклерозе, старческой слабости, половом бессилии, неврастении, малокровии, миокардите и подагре.
СПЕРМИН-ФАРМАКОН (ВЫТЯЖКА ИЗ СЕМЕННЫХ ЖЕЛЕЗ)
ПРОДАЖА во всех аптеках и магазинах санитарии и гигиены СССР.
Цена за 1 флакон 1 р. 50 к.
При отсутствии препарата на местах, заказы и деньги направлять: Минск, Советская, 71, аптека Наркомздрава.
Генеральный представитель по БССР—БЕЛМЕДТОРГ.
Изготовление препарата производится под постоянным наблюдением консультантов - профессоров.

Прыймо абвестак у гарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

МЕНСК

113 месц у дамох адпачынку для байцоў ДУА

Галоўсацстрах БССР прадаставіў у дамох адпачынку і санаторыях БССР для байцоў Далёка - Усходняй арміі—113 месц на ўвесь зімовы і летні сэзон.

100 камсамольцаў на палітасьветную работу на вёсцы

Менскі акруговы камітэт камсамолу мабілізуе 100 чалавек для пастаяннай палітасьветнай работы на вёсцы. З гэтае колькасьці 20 чалавек будуць накіраваны для культурнае работы па лініі сетцы спажывецкае кааперацыі. Усе мабілізаваныя пройдуць праз двухтыдзённыя курсы, якія адкрываюцца ў Менску з 1-га красавіка.

Хто атрымаў стыпэндыі імя Калініна

Прэзыдыум ЦВК СССР прадаставіў БССР тры стыпэндыі імя тав. М. І. Калініна. Сакратарыят ЦВК БССР пастанавіў назначыць гэтыя стыпэндыі наступным таварышом: студэнту пэдфаку т. Трусу (рабочы), студэнту хэмфаку —т. Паповічу (рабочы) і студэнту с.-г. акадэміі Брытаву (рабочы). Усе гэтыя таварышы маюць вялікі грамадзкі і партыйны стаж работы, а таксама добрыя акадэмічныя посьпехі. Разьмер стыпэндыі—150 рублёў.

Кантрактацыя студэнтаў факультэту савецкага будаўніцтва

Сакратарыят ЦВК зацьвердзіў заяўку факультэту Савецкага будаўніцтва і права БДУ на падрыхтоўку ў працягу пяцігодкі работнікаў савецкага будаўніцтва — 14 чалавек для апарату ЦВК, 50 чалавек для акрвыканкомаў, 210—для райвыканкомаў, 25—для гарсаветаў, 200 для сельскіх і местачковых саветаў.

Перавыбары саветаў Менскай акругі

— Усе члены прэзыдыуму Менскага акрвыканкому выехалі ў раёны для ўдзелу ў рабоце па перавыбарах саветаў.

— Прэзыдыум Менскага АВК пастанавіў прыступіць у раёнах суцэльнае калектывізацыі (Барысаўскім, Капыльскім і Сьмілавіцкім) да рэарганізацыі сельскіх саветаў з такім разьлікам, каб колькасьць саветаў адпавядала колькасьці куставых аб'яднаньняў. Кожнае куставое аб'яднаньне калгасаў будзе абслугоўвацца адным сельсаветам.

— У Бягомльскім раёне Менскае акругі пераабраны Кадлубінскі сельсавет. На выбары зьявілася 78,7 проц. выбаршчыкаў, жанчын—68,16 проц. У склад сельсаветаў увайшло жанчын — 20 процантаў, камуністых — 15 проц., сялян-беднякоў, вызваленых ад падаткаў 95 проц., у тым ліку 36 проц. калгаснікаў, служачых—5 проц.

Менск, Галоўлітбел № 337.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.